Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

31 САКАВІКА 2017 г. ПЯТНІЦА № 61 (28425)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**5 пытанняў пра пасылкі**

СТАР. 5



**Чым забаўляюць гледачоў**

СТАР. 9



**Праграма тэлебачання на тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Ірына КАСЦЕВІЧ, міністр працы і сацыяльнай абароны:**

*«Арсенал мер актыўнай палітыкі занятасці ўключае працаўладкаванне на існуючыя вакансіі і новыя працоўныя месцы, навучанне запатрабаваным на рынку працы прафесіям (спецыяльнасцям), перасяленне да новага месца жыхарства і працы, падтрымку самазанятасці шляхам выдзялення субсідый на адкрыццё ўласнай справы, арганізацыю грамадскіх аплатных работ. Прэзідэнт паставіў задачу працаўладкаваць усіх, хто можа і хоча працаваць. Служба занятасці акажа максімальную падтрымку такім людзям. Але і мясцовыя ўлады павінны больш актыўна дзейнічаць».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 31.03.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8720 | ▼ |
| Еўра | 2,0111 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0331 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0692 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# НАДЗЕЙНАЯ АПОРА, НАДЗЕЙНЫЯ СЯБРЫ

## Так бачаць адно аднаго Беларусь і Туркменістан

**Афіцыйны візіт Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Туркменістан, які працягваецца і сёння, — шосты па ліку. Гурбангулы Бердымухамедаў, кіраўнік Туркменістана, прыязджаў у Беларусь чатыры разы. Ужо гэты факт можа сведчыць аб стратэгічным характары партнёрства паміж дзвюма дзяржавамі, якое падтрымліваецца на самым высокім узроўні.**

І хоць краіны далёкія адна ад адной геаграфічна і не маюць агульных межаў, падстаў для плённага супрацоўніцтва дастаткова. У сённяшняй глабальна-палітычнай сітуацыі, якая склалася, вельмі важна мець сяброў і падтрымку не толькі побач, але і ў іншай частцы свету.

Аб гэтым гаварыў Прэзідэнт нашай краіны Аляксандр Лукашэнка на афіцыйных перагаворах з Прэзідэнтам Туркменістана Гурбангулы Бердымухамедавым у фармаце сам-насам: «Вы павінны ведаць, што там, у цэнтры Еўропы, у вас ёсць надзейная апора і надзейныя сябры. Вы можаце разлічваць на Беларусь. Абсалютна ўпэўнены, што так будзе рабіць і кіраўніцтва гэтай цудоўнай зямлі на чале з яго Прэзідэнтам, маім даўнім сябрам».

СТАР. 2



Фота БЕЛТА.

**Аляксандр ЛУКАШЭНКА і Гурбангулы БЕРДЫМУХАМЕДАЎ перарэзалі сімвалічную стужку, адкрываючы комплекс будынкаў пасольства Беларусі ў Туркменістане.**



# АРЭЛІ ДЛЯ БАБУЛІ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Жыхарка вёскі Пераpоў Жыткавіцкага раёна Ганна ХМЕЛЬ і яе ўнучка Настасся ШВЕЦ.**

■ Руплівым гаспадарам

# БЕЛАРУСКІ САД У ГОД НАВУКІ,

## або Дзе шукаць «свае» яблыкі

**У беларускіх садаводаў-аматараў і фермераў шмат дасягненняў, але хапае і пытанняў. А дзе ж можна атрымаць адказы на іх, як не ў кіраўніцтва Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Інстытут пладаводства», што знаходзіцца ў Самахвалавічах.**

***— Нярэдка ў невялікіх гарадах і мястэчках, а таксама каля дарог прадаюць саджанцы махляры — іншае слова цяжка падабраць. Як з імі можна змагацца, я пацікавіўся ў выконваючага абавязкі дырэктара, кандыдата сельгаснавук, дацэнта Анатоля КРЫВАРОТА.***

— Каб не набыць няякасны матэрыял, трэба правяраць наяўнасць у гандляроў суправаджальных дакументаў на тавар: копію пашпарта гадавальніка, пуцявы ліст у кіроўцы, накладные і сартавыя пасведчанні на тавар.

***— Анатоль Міхайлавіч, колькі пладоваягаднай прадукцыі цяпер збіраецца ў беларускіх садах і якая ў гэтым доля дзяржаўнага і прыватнага сектара?***

— З кожным годам колькасць пладова-ягадной прадукцыі павялічваецца. У 2016 годзе ў гаспадарках усіх формаў уласнасці сабрана 705,4 тысячы тон пладоў і ягад, з якіх 146,2 тысячы



тон — у сельгасарганізацыях і фермерскіх гаспадарках (каля 21%), астатняе — у асабістых падсобных гаспадарках. Дарэчы, у параўнанні з мінулым годам вытворчасць пладовай прадукцыі павялічылася на 41,6 тысячы тон (40%). Гэта адбылося за кошт пачатку гандлёвага пладанашэння ў новых садах. Менавіта гэтая прадукцыя ідзе на захоўванне і ў зімова-веснавы перыяд трапляе ў гандлёвыя пункты.

СТАР. 22

# НАДЗЕЙНАЯ АПОРА, НАДЗЕЙНЫЯ СЯБРЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

А пра тое, што супрацоўніцтва паміж краінамі ўдала развіваецца ў многіх сферах, сведчыць перш за ўсё тавараабарот. За апошнія пяць гадоў ён дасягнуў $300 млн у абароце тавараў і паслуг. «Думаю, у гэтым напрамку рухаючыся, мы яшчэ нямала зробім і ў Беларусі, і на туркменскай зямлі», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

Туркменістан сёння актыўна развіваецца, робячы асаблівыя поспехі ў сферы эканомікі. Аляксандр Лукашэнка з гонарам адзначыў, што ў гэтым ёсць і ўнёсак беларусаў — будаўніцтва Гарлыкскага горна-абагачальнага камбіната. Рэалізацыя праекта, як адзначыў Прэзідэнт, была няпростай справай, аднак беларускія і туркменскія спецыялісты паспяхова завяршылі будаўніцтва.

У сваю чаргу Гурбангулы Бердымухамедаў адзначыў, што ўзаемадзеянне паміж дзяржавамі развіваецца вельмі актыўна. «Самае галоўнае — яно з году ў год актывізуецца. Мы ўпэўнены, што выйдзем на высокі ўзровень у пытаннях нашага супрацоўніцтва», — сказаў ён.

Адзін з найперспектыўнейшых кірункаў супрацоўніцтва — лагістыка. Беларусь гатова забяспечыць Туркменістан лагістычнымі цэнтрамі для арганізацыі паставак прадукцыі ў Еўропу, заявіў Аляксандр Лукашэнка, адзначыўшы, што такой магчымасцю ўжо скарысталася Кітай. Кіраўнік дзяржавы таксама дадаў, што многія краіны ўбачылі ў Туркменістане своеасаблівы плацдарм, адкуль можна гандляваць з вялікімі рэгіёнамі, пастаўляючы тавары ў тым ліку ў Іран, Пакістан, Індыю і арабскія краіны. «Нам трэба вызначыцца і выбраць калідор, па якім павінны перамяшчацца нашы грузы сюды і асабліва адсюль», — сказаў беларускі лідар.

На сустрэчы з прадстаўнікамі СМІ па выніках перагавораў Прэзідэнт Беларусі абазначыў некаторыя канкрэтныя праекты, на якіх можа засяроддзіца канкрэтнае супрацоўніцтва дзвюх краін. У прыватнасці, Аляксандр Лукашэнка заявіў аб гатоўнасці Беларусі стварыць дызель-поезд для гарачага клімату Туркменістана. Дзве краіны аб'ядноўвае імкненне да развіцця навукі, у Беларусі вітаюць супрацоўніцтва ў гэтым кірунку і спадзяюцца на канкрэтныя распрацоўкі ў сельскай гаспадарцы, энергазберажэнні, ахове здароўя, біятэхналогіях, адзначыў беларускі лідар. Беларусь таксама гатова аказваць падтрымку Туркменістану ў падрыхтоўцы кваліфікаваных кадраў у ССНУ і ўстановах прафтэхадукацыі.

На перагаворах была ўдзелена асаблівая ўвага павышэнню эфектыўнасці гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. «Мы адназначна выказаліся за тое, што патэнцыял у нас велізарны і той узровень, якога мы дасягнулі сёння, абсалютна не адпавядае гэтаму патэнцыялу, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Нам трэба ўсяляк нарошчваць узаемныя пастаўкі, аказваць паслугі, у тым ліку і будаўнічыя, каб гэты тавараабарот быў значна вышэйшы».

Па выніках перагавораў Аляксандр Лукашэнка і Гурбангулы Бердымухамедаў прынялі сумесную заяву, у якой адзначылі высокую дынаміку міждзяржаўнага дыялогу і станоўча ацанілі рэалізацыю раней дасягнутых дамоўленасцяў. Лідары краін пацвердзілі гатоўнасць паглыбляць двухбаковыя адносіны ў палітычнай, гандлёва-эканамічнай, навукова-тэхнічнай, культурна-гуманітарнай і іншых галінах.

Было таксама падпісана адзінаццаць дагавораў аб узаемадзеянні краін у розных сферах.

Учора ў Ашхабадзе з удзелам кіраўнікоў дзвюх дзяржаў быў урачыста адкрыты комплекс будынкаў пасольства Беларусі ў Туркменістане. Аляксандр Лукашэнка і Гурбангулы Бердымухамедаў перарэзалі сімвалічную стужку. «Узвядзенне ўласных будынкаў пасольстваў пацвярджае стратэгічны характар нашага партнёрства, сімвалізуе праверанаю часам дружбу беларускага і туркменскага народаў, якой мы вельмі даражым», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Сімвалічна, што практычна год таму Аляксандр Лукашэнка і Гурбангулы Бердымухамедаў разам прынялі ўдзел ва ўрачыстым адкрыцці комплексу будынкаў пасольства Туркменістана ў Беларусі. На мове дыпламатыі такія мерапрыемствы сведчаць шмат аб чым.

Сёння афіцыйны візіт кіраўніка Беларусі ў Туркменістан працягнецца. Аляксандр Лукашэнка і Гурбангулы Бердымухамедаў наведаюць Гарлыкскі горна-абагачальны камбінат, будаўніцтва якога было нядаўна завершана беларускім бокам. Кіраўнікі дзяржаў ва ўрачыстай абстаноўцы дадуць старт рабоце завода, а затым азнаёмяцца з вытворчасцю.

**Паводле БЕЛТА.**

## КАНФЛІКТУ НЯМА І НЕ БУДЗЕ

### Нафтагазавае пытанне паміж Беларуссю і Расіяй будзе вырашана

**Аб гэтым заявіў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь Аляксандр СУРЫКАЎ на прэс-канферэнцыі, прымеркаванай да Дня яднання народаў Беларусі і Расіі.**

Пасол нагадаў выказванне Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Уладзіміра Пуціна, якое было зроблена ў Кыргызстане, пра тое, што Беларусь і Расія з'яўляюцца брацкімі народамі і любыя спрэчкі паміж імі, у тым ліку нафтагазавыя, будуць урэгуляваны. Падобную заяву нядаўна зрабіў і Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

— Гэта сігналы, якія дазваляюць спадзявацца, што мы выйдзем з няўзгодненых дзеянняў у галіне газу і нафты і прыйдзем да кансэнсуснага рашэння, якое задаволіць абодва бакі, — адзначыў пасол.

Дарэчы, Аляксандр Сурыкаў адзначыў, што сустрэча Аляксандра Лукашэнкі і Уладзіміра Пуціна адбудзецца 3 красавіка ў Санкт-Пецярбургу. «Сустрэча будзе ў вузкім і шырокім фарматах», — дадаў пасол. Акрамя беларуска-расійскага супрацоўніцтва, бакі абмяркуюць развіццё Еўразійскага эканамічнага саюза.

На пытанне аб тым, чаго чакае Расійская Федэрацыя ад будучай сустрэчы, Аляксандр Сурыкаў адказаў, што Расія разлічвае на нармальны ўзаемавыгадны падыход у рамках Саюзнай дзяржавы.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ЗША заклікалі Косава зняць з разгляду законапраект аб стварэнні арміі

«Мы хацелі б, каб урад зрабіў крок назад і зняў закон са стала», — заявіў намеснік памочніка дзяржсакратара ЗША па справах Еўропы і Еўразіі Хойт Браян Йі. Ён таксама заклікаў Косава працягваць кансультацыі з этнічнымі меншасцямі наконт ідэі стварэння сваіх узброеных сіл і адобрыць пагадненне з Чарнагорыяй аб дэмаркацыі мяжы. Апошняе з'яўляецца «крокам да ЕС, да НАТА», заявіў амерыканскі эмісар.

Ідэя стварэння ў Косава паўнавартаснай арміі шляхам рэфармавання Сіл бяспекі ўпершыню прагучала ў Прышціне ў сувязі з сітуацыяй вакол цягніка Бялград — Косаўска-Мітравіца. Пасля гэтага інцыдэнту парламент непрызнанай рэспублікі ўхваліў ініцыятыву лідара Косава Хашыма Тачы аб стварэнні УС.

Масква таксама асудзіла гэтыя крокі ўлад Косава.

### Дачка Трампа Іванка стане яго бясплатным спецсаветнікам



Старэйшая дачка прэзідэнта ЗША Іванка Трамп стане афіцыйным дзяржаўным служачым, але пры гэтым будзе працаваць у Белым доме на бязвыплатнай аснове, паведамляе The New York Times. Раней ужо выказваліся меркаванні, што яна зможа працаваць без афіцыйнага статусу, у тым ліку атрымае доступ да сакрэтнай інфармацыі.

У сваёй заяве Іванка падкрэслівае: «Я чула пра некаторыя асцярогі, звязаныя з маім кансультаваннем прэзідэнта пры выкананні ўсіх правіл этыкі. Я буду выконваць функцыі супрацоўніка на бязвыплатнай аснове ў Белым доме, падпарадкоўваючыся тым жа правілам, што і іншыя федэральныя служачыя». Адвакат дачкі прэзідэнта ЗША Джэймі Гарэлік растлумачыў, што рашэнне аб неабходнасці афіцыйнага статусу «абумоўлена яе (Іванкі) прыхільнасцю да захавання федэральных этычных стандартаў і яе адкрытасцю да праціглеглых пунктаў гледжання».

### Шведу па памылцы даставілі ліст для Пуціна

Жыхар шведскага горада Трэлеборг атрымаў па пошце незвычайнае пасланне — ліст, адрасаваны... прэзідэнту Расіі Уладзіміру Пуціну, паведамляе мясцовае выданне Trelleborgs Allehanda.

На канверце адрасаванне было напісана па-шведску «Vladimir Putin, Moskva, Ryssland» і пазначаны адрас, які супадае з афіцыйным адрасам Крамля, — Масква, вуліца Ільінка, дом 23. Адрас адрацяніка на канверце не значыўся. Як менавіта ліст апынуўся ў яго скрыні, швед не разумее. Справа ў тым, што ў Трэлеборгу вуліц з назвамі, падобнымі да «Ільінка» або «Масква», проста няма. Суразмоўнік выдання таксама прызнаўся, што яму прыходзіла думка адкрыць канверт і паглядзець на яго змесціва, але ён вырашыў гэтага не рабіць з павагі да чужой прыватнай перапіскі.

Аб тым, што адбылося, швед паведаміў у мясцовую паштовую службу. Там выказалі здагадку, што памылка магла адбыцца па тэхнічнай прычыне. Справа ў тым, што сартавальная машына часам памыляецца, калі не можа разабраць напісаны ад рукі адрас. У прэс-службе кампаніі таксама выказалі шкадаванне ў сувязі з тым, што Уладзімір Пуцін не атрымаў ліст, які яму прызначаўся, і прапанавалі шведу апусціць канверт у найбліжэйшую паштовую скрыню ў надзеі, што з другой спробы ён усё ж такі будзе дастаўлены правільнаму адрасату.

## Парламенцкі дзённік

# ПЛАН РАБОТЫ ЎЖО ЁСЦЬ

### У Палаце прадстаўнікоў абмеркавалі змест наступнай сесіі

**Дзясяткі законапраектаў, візіты ў нашу дзяржаву некалькіх парламенцкіх дэлегацый і, безумоўна, 26-я сесія Парламенцкай асамблеі АБСЕ, якая пройдзе ў нашай сталіцы, — гэта толькі асноўныя планы Палаты прадстаўнікоў на веснавую сесію, якая адкрыецца ўжо ў наступны панядзелак, 3 красавіка.**

**Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу,** паведаміў, што ўжо распачата распрацоўка пакета бюджэтных дакументаў на 2018 год.

У маі ў Палаце прадстаўнікоў пройдзе семінар па пытаннях бюджэтнага заканадаўства, на якім дэпутаты змогуць падрабязна азнаёміцца з асноўнымі этапамі і асаблівасцямі бюджэтнага працэсу.

Найважнейшая задача міжнароднай павесткі — правядзенне Беларуссю ў ліпені бягучага года 26-й сесіі ПА АБСЕ.

— Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь паставіў задачу правесці яе на належным узроўні. Гэта затрабуе ад усіх дзяржаўных органаў — і ў першую чаргу ад Палаты прадстаўнікоў — максімальных намаганняў і адказнасці, — заявіў Уладзімір Андрэйчанка. — Мы таксама рыхтуемся да афіцыйнага візіту беларускай парламенцкай дэлегацыі ў Пакістан. Праграмай, акрамя сустрэч на высокім узроўні, прадугледжана правядзенне першага беларуска-пакістанскага сельскагаспадарчага форуму. У Беларусі ў найбліжэйшыя месяцы мы чакаем кіраўнікоў парламентаў Кітая, Чэхіі, Індыі і Пакістана.

**Леанід ЦУПРЫК, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце,** расказаў аб праекце парадку дня наступнай сесіі:

— На сёння ў праект уключана 30 пытанняў. З іх: 14 законапраектаў у першым чытанні, 4 — у другім, 9 ратыфікацый міжнародных дагавораў, а таксама два дэкрэты Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

## Сяўба

# КАЛІ ДЗЕНЬ ГОД КОРМІЦЬ

### Сёлета аграрыі разлічваюць на добры ўраджай збожжавых і... кавуноў



**У нашай краіне пачалася масавая сяўба яравых, а таксама назіраецца добры стан пасеваў азімых, заявіў учора намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Уладзімір ГРАКУН.**

У міністэрстве падлічылі, што цяпер ранніх яравых пасеяна на 20% запланаваных плошчаў. Традыцыйна ўвесну лідзіруе Гомельская вобласць, дзе ўжо засеяна больш за палову плошчаў. Прыступілі да сяўбы і Віцебскі рэгіён, які традыцыйна праводзіць пасяўную пазней за астатніх. «У нас ёсць усё неабходнае, каб дасягнуць такіх сур'ёзных вынікаў: спецыялісты, тэхналогіі і тэхніка, мы поўнасцю забяспечаны насеннем. На палявых работах сёння задзейнічана каля 4 тысяч пасяўных агрэгатаў, 1,8 тысячы збожжавых сеялак, больш за 5 тысяч энерганасычаных трактароў. Гатоўнасць гэтай тэхнікі — звыш 90%», — падкрэсліў Уладзімір Гракун.

Спецыяліст адзначыў, што якасныя азімыя мы маем асабліва ў паўднёвых раёнах, дзе вегетацыя ідзе ўжо ў поўную сілу і праведзены падкормкі мінеральнымі ўгнаеннямі. Пры гэтым ён паведаміў, што гібель азімых збожжавых у Беларусі склала каля 4%. Больш за ўсё пацярпеў рапс — на 7,6%.

Уладзімір Гракун таксама паведаміў, што Беларусь забяспечана насеннем збожжавых на 130%. «Ёсць страхавыя фонды, калі што, мы гатовыя своечасова перасеяць 30% плошчаў. Таксама мы поўнасцю забяспечаны насеннем па астатніх культурах — бульбе, цукровых бураках, лёну, заканчваецца падрыхтоўка насення шматгадовых траў», — адзначыў ён. Паводле слоў намесніка міністра, сёлета плануецца пасеяць кукурузу на плошчы 860 тысяч га, з іх 116 тысяч га будзе пасеяна на зерне. Акрамя таго, плануецца сабраць ураджай збожжа ў аб'ёме не менш як 8,8 млн тон, вырасціць 1,28 млн тон бульбы, 180 тысяч тон ільнотрасты і 4,8 млн тон цукровых буракоў.

Мяркуецца, што не будзе ў вясковай і істотных праблем з фінансаваннем запланаваных мерапрыемстваў. На правядзенне пасяўной сёлета накіравана прыкладна 1,8 млрд рублёў. Гэта будуць сродкі з бюджэту, уласныя сродкі прадпрыемстваў, а таксама крэдытныя рэсурсы. Уладзімір Гракун растлумачыў, што раней меркавалася выдаткаваць на гэта толькі 1,6 млрд рублёў, але суму потым падкарэкціравалі, бо рэсурсы даражэюць. Гэта датычыцца, у прыватнасці, азотных угнаенняў.

Намеснік міністра паведаміў, што на набыццё мінеральных угнаенняў запланавана накіраваць 730 млн рублёў, на сродкі абароны раслін — 259 млн, ГЗМ — 323 млн, рамонт тэхнікі — 181 млн, вапнаванне — 35 млн і на насенне — 183 млн рублёў. Паводле слоў Уладзіміра Гракуна, цалкам закрыць пытанне аб дэфіцыце мінеральных угнаенняў пакуль не ўдаецца. «Пры гэтым гаспадаркі атрымаюць іх больш за леташнія аб'ёмы. Азотных угнаенняў — атрымаюць на 48% больш за ўзровень мінулага года, фосфарных — на 75%. У цэлым 70% патрэбнасці ў мінеральных угнаеннях гаспадаркам будзе забяспечана, астатняе папоўнім за кошт арганічных угнаенняў», — растлумачыў ён.

Пад агародніннын культуры плануецца аддаць больш за 7 тысяч га. Традыцыйна будзем вырошчваць капусту, моркву, буракі, цыбулю і зялёны гарошак.

А яшчэ сёлета сяляне разлічваюць атрымаць добры ўраджай кавуноў. «Летась мы атрымалі нядрэнны ўраджай бахчавых — 808 тон кавуноў. Сёлета плошчы пад гэтымі культурамі застаюцца на ўзроўні мінулага года, але ўраджай мы чакаем трохі вышэйшы. І ўраджай павінны атрымаць якасны, каб цалкам забяспечыць насельніцтва Беларусі і мець экспартны патэнцыял», — падкрэсліў намеснік міністра. Ён нагадаў, што ў 2016 годзе пад бахчавыя было аддадзена 65 га. Уладзімір Гракун адзначыў, што якасць беларускіх кавуноў ацанілі і ў Расіі. Летась беларускі кавун нават у Астрахані атрымаў добрую ацэнку. Цяпер спецыялісты ўпэўнены, што экспарт кавуноў можа дапамагчы атрымаць дадатковую валюту, якую можна будзе накіраваць на набыццё сродкаў аховы раслін, мінеральных угнаенняў і насення.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

**ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**3 красавіка 2017 г. у 15.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудзецца адкрыццё другой сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання.**

## ГРОШЫ НА ДОБРУЮ СПРАВУ

**У Магілёве сродкі ад збору па Дэкрэце №3 ідуць на будаўніцтва дзіцячага сада.**

Пра гэта карэспандэнту «Звязды» паведаміла **намеснік начальніка фінансавага аддзела Магілёўскага гарвыканкама Галіна МАЙСТРОВА.**

— Сёлета будаўніцтва гэтага садка ў Казіміраўцы не было запланавана, не хапала сродкаў, але за кошт гэтых грошай яно вядзецца, — удакладніла яна. — Гэта будзе сучасны дзіцячы сад на 240 месцаў, які вельмі запатрабаваны ў такім вялікім і адносна маладым мікрараёне.

Усяго на 30 сакавіка паступіла 948,6 тысячы рублёў (з пачатку года — 359,1 тысячы) гэтага збору. Усе яны ўкладзены ў дзіцячы садок. І грошы працягваюць паступаць. За сакавік іх было пералічана 6,5 тысячы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*


**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА**

| Наименование | Характеристика |
| --- | --- |
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | Капитальное строение, инв. № 412/С-23409 (назначение – здание многофункциональное, наименование – здание сепараторного отделения), площадью 242,3 кв. м м п., расположенное по адресу: Мостовский р-н, а.г. Лунно, ул. Гродненская, 8 |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 424082706601000553, (назначение – для обслуживания производственного участка сепараторного отделения), площадью 0,1386, расположенном по адресу: Мостовский р-н, а.г. Лунно, ул. Гродненская, 8 |
| **Начальная цена продажи** | 18 975,49 р. (восемнадцать тысяч девятьсот семьдесят пять рублей сорок девять копеек) |
| **Сумма задатка** | 1 897 р. (одна тысяча восемьсот девяносто семь рублей) |
| **Продавец** | ОАО «Щучинский маслосырзавод», 231513, г. Щучин, ул. 17 Сентября, 45, 8-01514-270-82 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб.209, тел. 41-98-32 |
| **Условия аукциона** | Аукцион без условий |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/сч для перечисления задатка** | 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 20 апреля 2017 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209.**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 05.08.2016 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу:**
**г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209,**
**с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**
**Последний день приема заявлений – 17 апреля 2017 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»*
*http://grodnoino.by/*


■ Надвор'е

# ВОСЬ ВАМ І ПЛЮС 20 НА ВЫХАДНЫЯ

## Сёлета сакавік стаў на 5—7 градусаў цяплейшы




**Першыя красавіцкія дні будуць вельмі цёплыя, паведамляе намеснік начальніка службы метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Святлана РЫБАКОВА.**

Спецыялісты адзначаюць анамальна цёплы першы месяц вясны, калі, паводле папярэдніх звестак, сярэднямесячная тэмпература перавысіла кліматычную норму на 5—7 градусаў. За гэты час ападкаў амаль на ўсёй тэрыторыі Беларусі выпала больш за норму, толькі па ўсходзе краіны месцамі адзначаецца недабор вільгаці. Гэта так, але ў апошні дзень месяца чакаецца пагаршэнне надвор'я.

Сёння пад уплывам атмасферных франтоў амаль паўсюдна пройдзе дождж з мокрым снегам і парывістым ветрам. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе 3—9 цяпла, а па паўднёвым захадзе краіны будзе дасягаць ад плюс 10 да плюс 16 градусаў. Праўда, пагаршэнне надвор'я будзе нядоўгім, а першыя красавіцкія выхадныя стануць вельмі цёплымі.

У суботу да нас завітаюць малаактыўныя атмасферныя франты, услед за якімі пачне распаўсюджвацца цёплае паветра з боку паўднёвага захаду Еўропы. У асобных раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—8 цяпла, толькі па паўночным усходзе пры праясненнях яна можа панізіцца да нуля — мінус 3 градусаў. Удзень будзе 11—18 цяпла, а па паўднёвым захадзе паветра прагрэецца нават да плюс 20 градусаў. Толькі ў крайніх паўночна-ўсходніх раёнах максімальная тэмпература складзе 5—10 цяпла. Вельмі цёпла чакаецца і ў нядзелю. Надвор'ем будзе кіраваць вобласць павышанага атмасфернага ціску, сфарміраваная ў цёплай паветранай масе паўднёвых шырот, толькі ў паўночных раёнах адаб'ецца ўплыў малаактыўнага атмасфернага фронту. Будзе пераважна без ападкаў, толькі ўначы ў паўночна-ўсходніх, а ўдзень у паўночных раёнах краіны пройдуць невялікія кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе 3—9 цяпла, а ўдзень прыгрэе ад плюс 14 да плюс 21 градуса.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у панядзелак тэрыторыя Беларусі апынецца пад уплывам атмасфернага фронту, які змяшчаецца з паўночна-заходніх раёнаў Расіі. Уначы па паўночна-заходняй частцы краіны, а раніцай і ўдзень на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы магчымы слабы туман. Тэмпература паветра ў гэты час сутак складзе 3—9 цяпла. Удзень — 10—17 градусаў, а па паўднёвым усходзе — нават да плюс 18—20 градусаў. Сіноптыкі адзначаюць, што ў аўторак і сераду красавіцкая гарачыня крыху спадзе. Да нас завітаюць больш свежыя паветраныя масы, якія паступаюць з паўночна-заходніх раёнаў Расіі. У аўторак без ападкаў, а тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да плюс 7 градусаў, удзень — 7—13 цяпла. У сераду таксама будзе пераважна без ападкаў, толькі ўдзень па поўначы краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Прагназуецца, што тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да плюс 6 градусаў, а ўдзень будзе 7—14 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Факт

# МУФЛОН ЗАМЕСТ ДЗІКА?

**Доўгі час асноўным паляўнічым відам на Беларусі быў дзік. Але калі з-за афрыканскай свіной чумы дзіка не стала, паток замежных паляўнічых, якіх вабіла Беларусь, рэзка скараціўся. Лясныя гаспадаркі пачалі шукаць новыя шляхі для развіцця такой турыстычнай галіны.**



Так, у Капыльскім лясгасе з'явіўся фазанарый. Сёння яго магутнасці дазваляюць штогод утрымліваць да 5 тысяч птушак, і паляванне на фазана, якое вельмі папулярнае ў Еўропе, з мінулага года стала даступным і ў нашай краіне. Усё больш сродкаў укладаецца ў развіццё інфраструктуры. Як паведаміў **начальнік аддзела паляўнічай гаспадаркі Міністэрства лясной гаспадаркі Сяргей ШАСТАКОЎ**, на цяперашні момант у нашай краіне функцыянуе 95 паляўнічых комплексаў, якія абсталяваны ўсім неабходным, ёсць гарачая вада, саўны. Акрамя таго, актыўна будуюцца паляўнічыя вальеры, у тым ліку і прыватныя. Сярод іх ёсць і вельмі буйныя — агароджваецца да дзвюх тысяч гектараў. Там разводзяць дзікіх жывёл. Напрыклад, у адной з гаспадарак утрымліваецца каля 800 аленяў, 300 ланяў і 150 муфлонаў. Між іншым, такія новыя паляўнічыя віды, як лані і муфлоны, з'явіліся ў Беларусі тры гады таму.

Больш за ўсё ў беларускія лясы прыбывае паляўнічых з Расіі, хоць нямала прыязджае і з еўрапейскіх краін. Італьянцам больш падабаецца паляванне на птушак, на якое яны выбіраюцца са сваімі сабакамі. Турысты з Германіі, Францыі, Аўстрыі едуць паляваць на капытных.

«Замежнікам не так цікава здабываць тое, што ёсць у іх. Наша візітная картка — лось, таму што ў многіх краінах паляванне на яго забаронена», — заўважыў Сяргей Шастакоў. Ёсць аматары і на глушца. Акрамя таго, едуць замежнікі і на ваўкоў — гэтых звяроў забаронена адстрэльваць у большасці краін Еўрасаюза, у нас жа іх развялося зашмат.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.** *dziadziula@zviazda.by*

**Работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю былога начальніка Упраўлення арганізацыйнай работы Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь КАСАРЭВІЧА Генадзя Іванавіча і выказваюць глыбокае спачуванне яго родным і блізкім.**

■ Ну і ну!

# АДШУКВАЕЦЦА НЕРУХОМАСЦЬ,

## ці Укралі... дачны дом

**Гэты незвычайны выпадак адбыўся ў Рэчыцкім раёне. Тут невядомыя ўкралі аднапавярховы дом агульнай плошчай каля 20 квадратных метраў.**



Паводле інфармацыі УУС Гомельскага аблвыканкама, першай трывогу забіла суседка дачніцы па пасёлку каля вёскі Дзяражня — уладальніцы нерухомай маёмасці: якраз з-за яе адсутнасці. Пра знікненне дома яна і паведаміла гаспадыні, якая, як высветлілася, не была на дачы з лістапада мінулага года. Жанчына мусіла звярнуцца ў міліцыю. На месцы праваахоўнікі ўбачылі толькі падмурак дома. Цікава, што на хатнія рэчы зламыснікі не паквапіліся. Слядоў работы будаўнічай тэхнікі выяўлена не было. Як расказаў адзін з суседзяў, яшчэ ў канцы лютага дом стаяў на сваім месцы. Заведзена крымінальная справа, праводзіцца аператыўна-вышуковыя мерапрыемствы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# УКРАЛА Ў ДЗЯДУЛІ ОРДЭН ЛЕНІНА

**Махляры і прайдзісветы зноў крыўдзяць старых. Гэтым разам зламысніца прыкінулася не работнікам сацыяльнай службы, як звычайна, а журналісткай, што піша на гістарычныя тэмы.**

82-гадовы жыхар Баранавіч расказваў у міліцыі, што да яго прыйшла жанчына, якая назвала сябе карэспандэнтам адной з брэсцкіх газет. Яна паведаміла, што збірае матэрыялы пра баявыя дзеянні ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны. Пенсіянер запрасіў госцю ў кватэру. Там яна і распачала «інтэрв'ю», стала задаваць пытанні і запісваць. Потым папрасіла ветэрана паказаць узнагароды. Асабліва цікавілася ордэнам Леніна. Пасля таго як незнаёмка пайшла, дзядуля заўважыў прапажу ордэна і звярнуўся ў міліцыю. Зламысніцу шукаюць.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

# «ТРЭБА БЫЦЬ КРЫШАЧКУ ЮВЕЛІРАМ»

**Следчы Аляксандр ПАНАСЕВІЧ пра асаблівасці сваёй прафесіі, падрабязнасці турэмнага жыцця злачынцаў з «марозаўскай» банды і зніклых без вестак, якія знаходзіліся ў... шафе.**

*— Першая зброя следчага — гэта ветлівасць, другая — ручка, каб аператыўна задакументаваць усе абставіны на месцы злачынства, — адразу ж даводзіць да ведама* ***старшы следчы Магілёўскага міжраённага аддзела Следчага камітэта маёр юстыцыі Аляксандр Панасевіч****, і я лаўлю сябе на думцы, што ў гэтым нашы прафесіі аднолькавыя. А яшчэ ва ўменні наладжваць кантакт з чалавекам і ўнікаць у яго псіхалогію. Па сабе ведаю, як гэта бывае цяжка, а таму амаль гадзіну цярпліва чакаю, пакуль мой суразмоўца гутарыць за зачыненымі дзвярыма з падазраваным. Прысутнічаць на допытах староннім людзям, нават калі ты карэспандэнт, нельга. Тайна следства.*

## Жыццё па раскладзе

— Адначасова ў рабоце знаходзіцца па 5—6 спраў, сёння, напрыклад, займаюся непасрэдна дзвюма, — дае справаздачу мой суразмоўца, як толькі заканчвае допыт. — Адна з іх датычыцца вынясення прадстаўлення аб прыцягненні да адказнасці падазраванага, у сувязі з чым яго трэба было азнаёміць з правамі, матэрыяламі крымінальнай справы, дапытаць і абраць меру стрымання. Па другой справе неабходна назначыць экспертызы, распланаваць допыты сведак.

Наогул планаваннем Аляксандр Панасевіч займаецца пастаянна. Крымінальныя справы, матэрыялы праверак — работы шмат, і трэба яшчэ ўкласціся ў строга акрэсленыя працэсуальныя тэрміны расследавання.

— Без планавання ніяк, — запэўнівае ён. — Ад гэтага залежыць ход расследавання. Трэба запланаваць удзел у справе і іншых асоб. Напрыклад, для агляду месца злачынства сабраць панятых, забяспечыць прысутнасць законнага прадстаўніка, вызначыцца з канвойным падраздзяленнем, калі размова ідзе пра затрыманне. Пры прызначэнні следчага эксперымента — знайсці статыстаў, дамовіцца з судова-медыцынскім экспертам. Немагчыма сабе дазволіць праводзіць усё гэта, не спланаваўшы. Неабходна вызначыцца з кожным следчым дзеяннем, якое трэба выканаць да накіравання справы ў суд.

Знаходзіць выйсце з заблытаных гісторый Аляксандру падабалася заўсёды, але ўсведамленне, кім хочацца стаць, прыйшло дзесьці гадоў у 19. Калі пасля заканчэння акадэміі МУС 12 гадоў таму пайшоў працаваць следчым, зразумеў, што не памыліўся.

— Работа цяжкая, напружаная. Цягаць мяшкі не трэба, але той груз адказнасці, які кладзецца на плечы, таксама важкі, — кажа ён. — Менавіта следчы прымае рашэнне аб затрыманні чалавека, абмежаванні яго правоў, волі. А гэта не так проста, бо ў кожнага ёсць сем'я, блізкія, родныя, для якіх гэта вельмі балючы момант. Калі толькі пачынаеш працаваць, шмат нюансаў не ведаеш, вопыт назапашваецца з гадамі. Дагэтуль з удзячнасцю ўспамінаю словы свайго старэйшага калегі: «Калі ты зможаш следчым шляхам даказаць віну чалавека, не абразіўшы яго, падмацаваць доказамі так, што ён зразумее — дзецца няма куды, ён цябе будзе паважаць». Гэта правіла стала маім жыццёвым крэда. І прыемна, што ў маім жыцці здараліся такія сітуацыі, калі былыя падследныя пасля адбыцця пакарання прыходзілі і дзякавалі проста за чалавечыя адносіны. Калі нехта спатыкнуўся ў жыцці, гэта яшчэ не падстава зневажаць яго. Усё будуецца на доказнай базе і ўнутраным перакананні следчага. І для гэтага, як той казаў, трэба мець халодную галаву, гарачае сэрца і чыстыя рукі. Для следчага гэты прынцып вельмі важны. Не адзін бязвінны не павінен сядзець у турме.



Аляксандру ПАНАСЕВІЧУ падабаецца займацца заблытанымі гісторыямі.

## Спакой нам толькі сніцца

Допыты, планы, крымінальныя справы — гэта яшчэ не ўсё. Праца следчага далёка не кабінетная. Гэта яшчэ і следчыя эксперыменты, і выезды на месца злачынства. І калі ў знакамітым серыяле «Месца сустрэчы змяніць нельга» следча-аператыўнай групай кіруе непасрэдна начальнік аддзела па барацьбе з бандытызмам Глеб Жаглоў, то ў звычайным жыцці гэта абавязкі выконвае менавіта следчы. Гэта ён павінен агледзець месца здарэння, дапытаць сваякоў, прызначыць экспертызы, паставіць задачы перад супрацоўнікамі крымінальнага вышуку на адпрацоўку спецкантынгенту або ўстанаўлення сведак здарэння. Уся інфармацыя акумулюецца ў следчага, і ён вырашае, распачынаць крымінальную справу або не.



Некалькі рухаў — і нябачнае становіцца бачным.

— А бывае, што выехалі на адно злачынства, а потым узнікала неабходнасць ехаць на іншае? — цікаўлюся я.

— Былі сітуацыі, калі ранiцай выязджалі на забойства, потым ехалі на крадзеж, потым на хуліганства і вярталіся толькі бліжэй да раніцы наступнага дня, — прызнаецца Аляксандр. — Таму ў кожнага з сабой заўсёды папка дакументаў — пратаколы агляду, допыту пацярпелага, сведак, назначэння розных экспертыз.

— Ваша праца, безумоўна, сур'ёзная, але магчыма бывалі і кур'ёзныя выпадкі?

— Былі, і не раз. Калі паступае сігнал аб знікненні чалавека, мы найперш выязджаем на месца яго звычайнага знаходжання. Аднойчы жанчына паведаміла, што знікла яе дачка. Прыехалі да яе, а яна п'яная, расказвае, як усё было, просіць знайсці дачку. Мы пачынаем аглядаць кватэру і знаходзім без вестак зніклую... у шафе. Дачка прызнаецца, што баялася пакарання ад маці, таму і схавалася. Або прыходзім да родных злачынца, які ў вышуку. Яны запэўніваюць, што не бачылі яго, а мы знаходзім прапажу пад ложкам. Былі выпадкі, калі людзі хаваліся ад нас на балконе і нават за шафай.

## Як я вучылася здымаць адбіткі пальцаў

Каб мне было прасцей унікнуць у прафесію, Аляксандр ставіць перада мной серабрысты чамаданчык.

— На той выпадак, калі ў аператыўнай групе не аказалася эксперта судовых экспертыз, мы гэтую місію бяром на сябе, — тлумачыць ён прызначэнне таямнічага прадмета і раскрывае яго.

Вочы разбягаюцца ад вялікай колькасці разнастайных зразумелых і незразумелых прыстасаванняў. Чаго тут толькі няма — нажніцы, ручкі, алоўкі, рулетка, люстэрка, клей... Тут жа нейкія слоікі з рознакаляровымі парашкамі, вадкасці, іншыя таямнічыя рэчы.

— У некаторых у арсенале бывае нават піла, — уражвае Аляксандр.

— А падсітак навошта, — не стрымліваюся я ад здзіўлення, убачыўшы гэты чайны прадмет.

— Ён прымяняецца для прыгатавання гіпсавага злепка, — тлумачыць следчы. — Цераз яго зручна прасяваць гіпс.

У руках суразмоўцы паяўляецца ліхтарык з ультрафіялетавым, як ён па ходу тлумачыць, святлодыёдам. З яго дапамогай вельмі проста знайсці біялагічныя сляды, калі была спроба ад іх пазбавіцца. Пад уздзеяннем ультрафіялетавага прамення на паверхні хутка вымалёўваюцца плямы крыві, сліны і ўсяго астатняга, што мае біялагічнае паходжанне.

— А зараз будзем вучыцца здымаць адбіткі пальцаў, — усміхаецца Аляксандр і дастае з чамаданчыка дактыласкапічны магнітны парашок. З дапамогай спецыяльнага прыстасавання ён наносіць яго на месца, дзе толькі што спецыяльна пакінуў свой пакуль што нябачны адбітак. І той паступова праяўляецца, як малюнак на негатыве. Следчы фіксуе адбітак з дапамогай скотча і наносіць на паперу. Калі б гаспадар пальчыка быў невядомы, яго было б проста знайсці пры дапамозе дактыласкапічнай экспертызы.

## Пра рэзанансныя справы

Летась Аляксандр Панасевіч накіраваў у суд 62 справы. Гэта шмат, калі ўлічыць, што на адну справу прыходзілася менш за тыдзень. Сярод шэраговых крымінальных гісторый заўсёды хапае і такіх, якія надоўга запамінаюцца. Як, напрыклад, з каштоўнымі камянямі. У Магілёве быў «спецыяліст», які вельмі добра іх падрабляў і рэалізоўваў. Без прафесіянала разабрацца, які камень ён устаўляў у золата — фіяніт, брыльянт, або кавалак шкла, было немагчыма. Прыходзілася ехаць у Мінск на гемалагічную экспертызу, каб атрымаць навукова абгрунтаванае меркаванне эксперта.

А гэта прыклад таго, як трэба працаваць на апярэджанне. Аднойчы з надзейных крыніц Аляксандру Панасевічу паступіла інфармацыя аб забойстве двух чалавек. У дзяжурнай часці, куды ён першай справай патэлефанаваў, каб даведацца, ці былі такі сігнал, нават здзівіліся: адкуль ён гэта ўзяў? А калі праверылі адрас, усё пацвердзілася: у кватэры знайшлі два трупы з мноствам нажавых раненняў. Дзякуючы аператыўнай інфармацыі, хутка знайшлі і злачынца. Як потым высветлілася, забойства было спантаннае. Тры раней судзімыя асобы сабраліся разам, выпілі і пасварыліся.

А яшчэ напрацоўкі Панасевіча былі выкарыстаны для ўдасканалення крымінальна-працэсуальнага заканадаўства. Справа датычылася фігурантаў славутай «марозаўскай банды», якая ў пачатку 1990-х трымала ў жаху ўвесь Гомель. Удзельнікі адбывалі пакаранне ў турме, але працягвалі парушаць закон. Карысталіся тым, што мелі аўтарытэт у злачынным свеце і рабілі ў турме ўсё, што хацелі. Не рэагавалі на патрабаванні прадстаўнікоў адміністрацыі, мелі шэраг спагнанняў. У адносінах да іх была распачата крымінальная справа па артыкуле 411 — злоснае непадпарадкаванне законам і патрабаванням адміністрацыі.

— У калоніях падобнае нярэдка здараецца, але па турмах такой практыкі амаль не было, — расказвае Аляксандр. — Для атрымання інфармацыі прыходзілася пісаць лісты ў Акадэмію МУС, цікавіцца меркаваннем прафесарска-выкладчыцкага складу. Пасылаў лісты ў навукова-практычны цэнтр пры Генеральнай пракуратуры, размаўляў з дацэнтам кафедры крымінальнага права БДУ, з людзьмі, якія пісалі каментарыі да Крымінальнага кодэкса. Ускрываліся праблемы, якія на стадыі напісання крымінальных артыкулаў не былі вывучаны. Некаторыя выкладчыкі з кафедры крымінальнага права потым яшчэ цікавіліся судовай практыкай, каб прымяніць гэты досвед пры навучанні студэнтаў. Прайшлі суды, абскарджанні ў касацыйным парадку.



Той самы чамаданчык.

І «марозаўцы» да ўжо існуючых тэрмінаў атрымалі яшчэ па паўтара года дадаткова. Гэта адыграла добрую прафілактычную ролю для іншых асуджаных, якія знаходзіліся ў папраўчых установах.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*


**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА**

| Наименование | Характеристика |
| --- | --- |
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | Капитальное строение, инв. №431/С-30199 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – кулинария), общей площадью 27,5 кв. м, расположенное по адресу: Кореличский р-н, г.п. Мир, пл. 17 Сентября, 15 |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 423385790601001187, площадью 0,0061 га (назначение – земельный участок для размещения объектов розничной торговли (кулинария)) по адресу: Кореличский р-н, г.п. Мир, пл. 17 Сентября, 15 |
| **Начальная цена продажи** | 13 991,50 р. (тринадцать тысяч девятьсот девяносто один рубль пятьдесят копеек) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 1 399 р. (одна тысяча триста девяносто девять рублей) |
| **Продавец** | Кореличский филиал Гроднооблпотребобщества, 231430, г.п. Кореличи, ул. 8 Марта, 28, тел. 8-01596-2-14-84 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38 |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/сч для перечисления задатка** | 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225. |

**Аукцион состоится 21 апреля 2017 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов по названной аукционистом цене. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 15.07.2016 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг), с 8.30 до 16.30 (пятница)**
**Последний день приема заявлений – 17 апреля 2017 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»*
**http://grodnoino.by/**

КАНТАКТ
№ 3 (43)
Спецпраект газеты «Звязда» сумесна з РУП «Белпошта» і РУП «Белсаюздрук»



■ Працоўная дынастыя

# ЖАРТ ЯК МЕТАД КІРАВАННЯ

## Ветэран Ельскай пошты Рыгор РУЦКІ дае жыццёвыя ўрокі

**— Я заўсёды быў з вусамі.
Мае падначаленыя пыталі адно аднаго:
«Ну як, вус у яго не апусціўся?» —
«Ды не!» — «Тады ўсё добра!»
Байкі, у тым ліку пра сябе, Рыгор Пятровіч Руцкі рассыпае, нібы зерне.
Сёння пенсіянер, але ж шмат гадоў ён быў начальнікам Ельскага раённага вузла паштовай сувязі. Дарэчы, да гэтага, яшчэ з 1984 года, узначальваў аналагічную структуру, якая ўключала ў сябе і тэлефонную сувязь.
Разам з ім працавала і яго жонка Лідзія Гаўрылаўна, а цяпер сын Пётр працягвае сямейную традыцыю — працуе кіроўцам на мясцовай пошце.**



Рашэнне — на каго вучыцца — Рыгор прыняў у 1967 годзе, калі здаваў экзамены пасля школы. У газеце прачытаў аб'яву пра мінскі электратэхнікум сувязі і дакладна зразумеў: гэта яго. Да таго ж сваякі і сябры таксама раілі туды паступаць, ведаючы схільнасці маладога чалавека. Больш таго, яго бацька доўгі час быў электраманцёрам сувязі ў вёсцы Скароднае. Таму прафесія яму дасталася, можна лічыць, у спадчыну.

У 1970 годзе юнак закончыў тэхнікум, пасля чаго адслужыў у арміі. Са сваёй спадарожніцай жыцця Лідай пазнаёміўся ў Мінску, дзе былі думкі застацца жыць. Але ж, калі нарадзіўся старэйшы сын, урачы параілі змяніць клімат і перабрацца бліжэй да прыроды. Прыйшлося думаць пра змену месца жыхарства, бо хлопчык вельмі хварэў. Так маладыя пакінулі сталіцу і пераехалі на радзіму — у саўгас «Камуніст».

— Мы 10 гадоў жылі на вёсцы, — успамінае Рыгор Руцкі. — Да 1984 года. Увесь той час працаваў у ПМК галоўным энергетыкам. А ў 1984 годзе райкам партыі прапанаваў мне заняць пасаду начальніка вузла электрасувязі. Вось так і адпрацаваў я 13 гадоў кіраўніком спачатку агульнага вузла, а потым яшчэ 16 гадоў — на пошце.

Самымі складанымі былі, гаворыць Рыгор Пятровіч, як і для ўсіх у краіне, 80—90-я гады мінулага стагоддзя. З Ельшчыны, калі здарылася Чарнобыльская катастрофа, многія ад'ехалі. Руцкія Чарнобыль перажывалі на сваёй роднай зямлі і ўсёй сям'ёй.

— Нікуды не паехалі, хоць былі прапановы перабрацца бліжэй да сталіцы. Да таго ж у 1987 годзе, занадта рана, памёр бацька. Маці засталася побач у вёсцы — гэта 40 км ад Ельска. Ёй дапамога была патрэбна. Таму мы не пакідалі Ельск і сваю пошту. Цяжка было — не хапала людзей. Тыя ж, хто застаўся, вельмі адказна ставіліся да сваёй справы. Моцных збояў у рабоце не было. Але ж прыходзілася часам дастаўляць пошту амаль выпадковымі людзьмі. Было і так, што дзяліліі адзін незакрыты ўчастак паміж рознымі супрацоўнікамі.

Пад кіраўніцтвам Рыгора Руцкага працавалі 170 чалавек, большасць з якіх — жанчыны. Вядома ж, індывідуальны падыход патрабаваўся да кожнай. Кажа: з адной добра трэба пагаварыць, а іншую і адчытаць.

— Усякага было. Але ж у любым выпадку трэба заставацца справядлівым і сумленным. Здаралася, адна супрацоўніца на іншую нешта нагаворыць. Я ніколі абедзвюх разам не выклікаў у кабінет. Паразмаўляю спачатку з адной, потым — з другой. Бывала, жартамі абыходзілася. Здаралася, што выганяў з работы — бо было за што. Між тым і яны цяпер са мной вітаюцца, крыўду не трымаюць. Я і зараз у курсе спраў пра тое, што робіцца на нашай пошце. Сябры ў сувязі ў мяне засталіся, усе добрыя людзі, сустракаемся, пытаюць пра здароў'е.

**Сувязісты павінны быць на парадак вышэй за ўсіх. Я імкнуўся заўсёды трымаць гэтую планку. У 2010 годзе наш вузел сувязі заняў першае месца ў краіне. А ў 2008 годзе мне прысвоілі званне заслужанага сувязіста Рэспублікі Беларусь.**

— Да таго ж наша дзіця мае патрэбу ў штодзённых распрацоўках кантрактур (тугарухомасць суставаў. — **Аўт.**), — гэта праца з суставамі па гадзіне раніцай і ўвечары, — тлумачыць Алена. — Калі мы не будзем гэтага рабіць, хутка наступіць агульны параліч. Дзіця пакутуе, калі не аказваць яму своечасовую дапамогу. Кінуць усё і проста назіраць, што з ім будзе далей, — маўляў, усё роўна дапамагчы нельга — мы не можам. Такім дзіцем трэба штодня займацца, і гэта цяпер ляжыць на маім мужу.

Цяпер сям'я Алены і Віталя Кірыенкаў жыве на дзіцячую пенсію і дапамогу Алены па доглядзе за дзіцем. Выйсцем для іх стаў бы школьны аўтобус. «Муж зноў пайшоў бы працаваць, — кажа Алена. — Да таго ж гэта было б вялікай дапамогай для ўсіх сем'яў нашага раёна, у якіх ёсць дзеці-інваліды. Малыя, якія цяпер знаходзяцца на надомным навучанні, атрымаюць рэальную магчымасць выйсці з ізаляцыі. Ды і ўзровень ведаў у школе даецца зусім іншы. Плюс зносіны, сябры — жыццё дзіцяці з інваліднасцю можа цалкам памяняцца! Яно пачне жыць, а не будзе абмежаваным квадратнымі метрамі свайго пакоя!»...

Рана ці позна Мікіта сядзе ў інвалідную каляску. «Мы ўжо пачалі пошукі добрай электракаляскі, — у Алены няма ілюзій. — Разумееце, мы жывём дзеля сваіх дзяцей, яны — сэнс нашага жыцця!»

Нядаўна сям'і дапамаглі з каляскай зусім незнаёмыя людзі, аплаціўшы яе кошт. Застаецца адно вялікае пытанне — як дабірацца ў школу? У маі 2016 года Алена звярнулася ў адміністрацыю навучальнай установы з заявай: «Прашу арганізаваць падвоз майго дзіцяці да школы». У адказ пачула, што ў школы няма транспартнага сродку. «Дык давайце разам думаць, што рабіць», — лічыць Алена.



Мікіта вельмі добра вучыцца.

Адміністрацыя Ленінскага раёна Мінска звярнулася з просьбай аб аказанні дапамогі ў сталічныя арганізацыі, аднак не знайшла водгуку.

Але Алена не збіраецца ставіць на гэтым кропку. «Што, калі сабрацца ўсім нам, былым дзецям, якія мелі бесклапотнае і паўнавартаснае дзяцінства, а цяпер ужо выраслі, і паспрабаваць дапамагчы дзецям з менш шчаслівым лёсам»? — жанчына не апусціла рук і збіраецца арганізаваць збор сродкаў, каб дапамагчы купіць школьны аўтобус для дзяцей-інвалідаў. Марная гэта думка ці не, Алена Кірыенка яшчэ не ведае, але яна ўпэўнена, што зробіць усё, каб аўтобус у школы быў.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*


## ИЗВЕЩЕНИЕ

**о проведении повторного аукциона**

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» *(организатор аукциона)* по поручению **ОАО «Борисовское предприятие музыкальных инструментов»** *(продавец)* проводит открытый аукцион по продаже:

**Лот №1:** Склад готовой продукции, общ. пл. 717,0 кв. м, инв. №610/С-53933, расположен на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001104 площадью 0,0878 га *(предоставлен на праве аренды)* по адресу: Минская область, Борисовский район, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/11;

**Начальная цена с НДС – 70 143,36 бел. руб. (Начальная цена снижена на 30%.) Задаток 10% от начальной цены – 7 014,33 бел. руб**.

**Лот №2:** Здание РМЦ, общ. пл. 1161,2 кв. м , инв. №610/С-53918, имущество согласно перечню *(с перечнем можно ознакомиться у организатора торгов),* расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001097 площадью 0,2003 га *(предоставлен на праве аренды)* по адресу: Минская область, Борисовский район, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/18;

Начальная цена с НДС (20%) – **106 519,59** бел. руб. *(в денежных единицах 2000 г. – 1 065 195 900 бел. руб.)*. **(Начальная цена снижена на 50%.)** Задаток 10% от начальной цены – **10 651,95** бел. руб.;

**Лот №3:** Пристройка к корпусу №1 *(изготовление футора)*, общ. пл. 1535,4 кв. м, инв. №610/С-53920, имущество согласно перечню *(с перечнем можно ознакомиться у организатора торгов),* расположена на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001098 площадью 0,1064 га *(предоставлен на праве аренды)* по адресу: Минская область, Борисовский район, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/23;

Начальная цена с НДС – **86 598,97** бел. руб. *(в денежных единицах 2000 г. – 865 989 700 бел. руб.)*. **(Начальная цена снижена на 50%.)** Задаток 10% от начальной цены – **8 659,89** бел. руб.;

**Лот №4:** Участок обработки чугунных рам, общ. пл. 507,5 кв. м, инв. №610/С-53931, имущество согласно перечню *(с перечнем можно ознакомиться у организатора торгов),* расположен на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001096 площадью 0,1429 га *(предоставлен на праве аренды)* по адресу: Минская область, Борисовский район, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/22;

Начальная цена с НДС – **23 740,33** бел. руб. *(в денежных единицах 2000 г. – 237 403 300 бел. руб.)*. **(Начальная цена снижена на 50%.)** Задаток 10% от начальной цены – **2 374,03** бел. руб.;

**Лот №5:** Электроцех, цех раскроя фанеры, компрессорная общ. пл. 639,2 кв. м, инв. №610/С-53929, имущество согласно перечню *(с перечнем можно ознакомиться у организатора торгов),* расположен на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001095 площадью 0,1457 га *(предоставлен на праве аренды)* по адресу: Минская область, Борисовский район, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/17;

Начальная цена с НДС – **75 581,73** бел. руб. *(в денежных единицах 2000 г. – 755 817 300 бел. руб.)*. **(Начальная цена снижена на 50%.)** Задаток 10% от начальной цены – **7 558,17** бел. руб.

**Задатки в размере 10% от начальной цены предмета аукциона, перечисляются на р/с №3012108260016 в ЦБУ №701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Порядок проведения аукциона регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 №16. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) календарных дней после подписания договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель). Аукцион состоится **18.04.2017 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17.04.2017 до 16.00** по указанному адресу. Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» от 04.05.2017.

**Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

■ Ёсць нагода

# Людзей насмяшыць

## Як і чым забаўляюць гледачоў беларускія тэлеканалы?

**...Нядаўна інтэрнэт абляцела віруснае відэа: амерыканскі дацэнт Роберт Келі, даючы па скайпе з дома актуальны каментарый для ВВС, імгненна стаў папулярным дзякуючы... сваім дзецям, якія ўбеглі ў пакой падчас прамога эфіру і зрабілі сур'ёзны сюжэт вельмі смешным.**

**Напярэдадні сусветнага Дня смеху «Звязда» таксама вырашыла не вынаходзіць веласіпед і пагаварыць пра тэлевізійны гумар айчыннай вытворчасці. Тым больш што дзеля гэтага неабавязкова лавіць «ляпы» і кур'ёзныя выпадкі ў эфіры — беларускае тэлебачанне падарыла сваім гледачам цэлы шэраг забаўляльных, парадыйных і нават сатырычных праектаў.**



### ДОЎГАЖЫХАР І ЯГО «ДЗЕЦІ»






Самая доўгайграючая гумарыстычная праграма — безумоўна, тэлевізійная версія гульняў Клуба вясёлых і знаходлівых. Першая гульня была паказана на Беларускім тэлебачанні ажно ў 1964 (!) годзе, калі сустрэліся прадстаўнікі Белдзяржуніверсітэта і сталічнага медыцынскага інстытута. Праўда, праз нейкі час КВЗ «закрылі» па ўсім Савецкім Саюзе спецыяльнай пастановай ЦК КПСС, і на тэлеэкраны гульня вярнулася зусім не хутка. Прынамсі, у Беларусі гэта адбылося ў 1997 годзе, калі беларускія КВЗшнікі трывала прапісаліся на Першым канале Белтэлерадыёкампаніі, а нязменным вядучым Беларускага КВЗ і пазнейшай Еўралігі КВЗ стаў Андрэй Мукавозчык.

Зрэшты, пасля шэрагу ўнутраных і вонкавых пертурбацый беларускі КВЗ неаднаразова мяняў і кіраўніцтва, і вядучага, і «прапіску». З 2009 года гульні вясёлых і знаходлівых (Еўралігу КВЗ) паказвала Сталічнае тэлебачанне, а пачынаючы з 2015-га спаборніцтвы афіцыйнай тэлевізійнай Міжнароднай лігі МС КВЗ праводзіць беларускі тэлевядучы Антон Мартыненка. Дарэчы, у бягучым сезоне нашу краіну прадстаўляюць тры каманды — зборная Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, «Дукаліс» (ВДТУ, Віцебск) і «Спадар Баршчэўскі» (Мінск).

На хвалі папулярнасці Клуба вясёлых і знаходлівых многія ягоныя ўдзельнікі нават пасля завяршэння «кар'еры» вяртаюцца ў тэлеэфір у іншых амплуа — як сцэнарысты, рэдактары альбо вядучыя новых праграм. Не стаў выключэннем і беларускі КВЗ, з крэатыўнай лабараторыі якога выйшла мноства праектаў. Напрыклад, у 2000 годзе сталічны 8 канал заманіў да сябе лідараў каманды «ЧП» Дзмітрыя Танковіча і Яўгена Смарыгіна з перадачай **«Доктар Х»** — смешнымі дыялогамі «доктара» з «пацыентамі», а ў 2003-м Дзмітрый Танковіч вядзе на БТ гумарыстычную перадачу **«Барахты з Бухты»**.

У 2007 годзе на Першым нацыянальным канале БТРК з'явілася **«Вось дык шоу!»** — музычна-забаўляльная праграма ў фармаце клубнай вечарынкі з удзелам маладых беларускіх КВЗшнікаў і артыстаў эстрады. Апошнія стойка вытрымлівалі пародыі на сваю творчасць і жарты накшталт: *«Для таго каб быць беларускім артыстам, трэба ўсяго толькі 17 тысяч рублёў: за дзве набываецца дыск-балванка, 15 ідуць на таксі на дыскатэку ў Серабранцы; дыск з песняй забываецца ў машыне».* У другім сезоне «Вось дык шоу!» стала фактычна філіялам КВЗ, дзе пад наглядам журы дзве каманды жартавалі на зададзеную тэму — але на гэтым гісторыя праграмы і скончылася.

Аднак галоўным і самым паспяховым парасткам КВЗ стаў праект Comedy Club — запазычаны з амерыканскай культуры размоўны клубны жанр, пабудаваны на імправізацыі і маналогу аднаго коміка. У беларускіх рэаліях праект, клапатліва падтрыманы маскоўскім «старэйшым братам», атрымаў назву **Comedy Club Minsk Style** і ў 2006 годзе з жартамі на мяжы фолу ўварваўся ў вячэрні эфір тэлеканала АНТ. Праз год з'явіўся яшчэ адзін вынік працы айчынных «камедыянтаў» — аналаг расійскага камедыйнага серыяла «Наша Belarussia», які пратрымаўся ў вячэрнім прайм-тайм некалькі гадоў запар. Зрэшты, дзе яны цяпер, колішнія рэзідэнты мінскага Comedy Club — Слава Камісаранка, Дзмітрый Няўзораў, Павел Крывец, Максім Т-34, Мікалай Камка ды многія іншыя? Адны працягнулі ўдасканальваць акцёрскае майстэрства ў прафесійных тэатрах, другія перакваліфікаваліся ў сцэнарысты і прадзюсары шматлікіх гумарыстычных шоу ды фільмаў, і абсалютная большасць з большым ці меншым поспехам працуюць на шырокім прасторы расійскіх тэлеканалаў. На слыху ў суайчыннікаў хіба што імёны Вадзіма Галыгіна, які давёў да дасканаласці свае шматлікія таленты артыста размоўнага жанру, акцёра, тэлевядучага, сцэнарыста, прадзюсара і нават спевака, ды Івана Вабішчэвіча, які пад сцэнічным імем Дзядзя Ваня паспяхова працягвае кар'еру тэлевядучага і спевака.

### БЫЛОЕ І ГУМАР



Кажуць, усё новае — добра забытае старое. Таму, хоць пра большасць гумарыстычных тэлепраграм айчыннай вытворчасці выпадае гаварыць у мінулым часе, нельга не згадаць найбольш яркія з іх.

Яшчэ на пачатку 90-х рэжысёр Ігар Краўцоў сабраў каманду добрых знаёмых са студэнцкіх тэатраў, разам з якімі стварыў перадачу **«Банка коміксаў»** — зборнік гэгаў для гледачоў 16+ (гэг — камічны эпізод, пабудаваны на відавочнай бязглуздзіцы, накшталт насіць ваду ў рэшаце). Цыкл забаўных гісторый, які беларускае тэлебачанне ўпершыню прадставіла ў 1993 годзе, пражыў у эфіры амаль 10 гадоў, а пасля з поспехам дэманстраваўся ў іншых краінах СНД. Крыху пазней з «Банкі коміксаў» выпаў **«Прэм'ер-парад»** — асобная штотыднёвая гумарыстычная перадача, гэткая экранізацыя анекдотаў з удзелам трох «прэм'ераў» — акцёраў Уладзіміра Байрачнага, Ігара Трацццяка і Дзмітрыя Афанасенкі.

Уменне не толькі пажартаваць з навакольных, але і пасмяяцца з сябе самога — вось што дае плюсік у карму тэлевядучага і дабаўляе прывабнасці праграме. Прынамсі, менавіта гэты рэцэпт зрабіў у свой час праграму **«Усё нармальна, мама!»** (1996—2004 гг.) без перабольшання ўсенародна любімай. Бесшабашнасць і хуліганісты настрой юнай Ларысы Грыбалёвай, памножаныя на смелыя эксперыменты рэжысёра Уладзіміра Максімкава і прадзюсарскі нюх Ягора Хрусталёва, зрабілі са звычайнага хіт-парада сапраўдную музычную камедыю. Як успамінаюць стваральнікі перадачы, па арыгінальнасці ў «мамы» канкурэнтаў не было: «Што мы толькі не рабілі: здымалі дагары нагамі, прывязвалі Ларысу да чагосьці, спрабавалі здымаць пад вадой, прыдумлялі смешныя рубрыкі накшталт «Шчас спяю», дзеля здымак у якой збіраліся натоўпы людзей...» На гонар творчай групе ніхто з удзельнікаў не перагрэўся ў промнях славы, і як толькі адчулі, што праграма страчвае былы кураж і актуальнасць, з ёй развіталіся. Дарэчы, пазнейшая спроба спалучыць музычны хіт-парад з гумарам — **«Ранішняя пошта на АНТ»** (2005) — поспех свайго папярэдніка паўтарыць не здолела.



У 2003 годзе тэлеканал АНТ зрабіў беспрэцэдэнтны захад — уласнымі сіламі зняў фантастычна-гумарыстычны тэлесерыял **«Гатэль «Выкананне жаданняў»**. Рэжысёры Ірына Васільева і Сяргей Арланаў, а таксама акцёры Алег Акуліч, Эвеліна Сакура, Алег Корчыкаў ды іншыя пастараліся на славу, і 12-серыйная гісторыя пра сям'ю Адамовічаў, якая ператварыла старую карчму ў сучасную гасцініцу, дзе разам з пастаяльцамі мірна ўжываецца самы сапраўдны прывід, выклікала ў гледачоў пераважна прыемныя эмоцыі і станоўчыя водгукі.





А вось сіткам вытворчасці тэлеканала СТБ **«Тэарэтыкі»**, зняты ў 2009 годзе, атрымаў гучную вядомасць з іншым знакам. Гледачы адзінадушна прызналі 4-серыйную беларускую камедыю палажэнняў з жыцця маладых фізікаў-ядзершчыкаў дрэннай копіяй амерыканскай «Тэорыі вялікага выбуху», стваральнікі атрымалі з'едлівы адкрыты ліст ад амерыканскага прадзюсара, і літаральна праз некалькі месяцаў скандальны праект быў прыкрыты.

У 2009—2010 гг. АНТ прадставіў гледачам забаўляльны праект **«Рэкламная паўза»**, вядучым якога стаў спачатку Яўген Булка, а потым дуэт вядомых гульцоў КВЗ Яўгена Смарыгіна і Дзмітрыя Танковіча. Акрамя штотыднёвага прагляду смешных і незвычайных рэкламных ролікаў з усяго свету, праект прапаноўваў гасцям адмысловыя заданні — адгадаць канцоўку роліка па першых кадрах, прачытаць «з выражэннем» кур'ёзныя рэкламныя аб'явы, адрозніць праўду ад выдумкі ў блоку навін. Часам было сапраўды смешна, дзенідзе трапна, месцамі няёмка.

Таксама ў 2010 годзе на тэлеканале «ЛАД» пачалося **«Халі-Галі»** — як запэўнівалі яго стваральнікі, «першае беларускае скетч-шоу з высокай шчыльнасцю гумару», або папросту 200-серыйны цыкл кароткіх гумарыстычных сцэнак з удзелам беларускіх акцёраў пад бадзёрую запеўку ад гурта «Лепрыконсы».

Па слядах расійскай іранічнай інфармацыйна-забаўляльнай перадачы «Пражэктарпэрысхілтан» беларускія тэлевізійнікі ў 2011 годзе зрабілі ўласныя студыйныя пасядзелкі ў выглядзе «некулінарнага ток-шоу **«Кухня»**. Мо штосьці набліталі з рэцэптам, але перадача ў складзе вядучых Люцыі Лушчык, Яўгена Булкі, гумарыстаў Яўгена Крыжаноўскага і Мікалая Камкі пратрымалася ў эфіры ўсяго адзін сезон (на АНТ).

### ГЕРОІ НАШЫХ ДЗЁН

За апошнія 5 гадоў шчыльнасць гумарыстычных тэлепраектаў на гадзіну вяшчання прынцыпова не знізілася, хоць падыходы ў многім памяняліся. Калі раней аўдыторыя больш глядзела на іншых, то сёння ўсё часцей стараецца паказаць сябе. Мабыць, гэтым абумоўленая папулярнасць праграмы **«Фактар смеху»** на АНТ (2011—2012), удзельнікі якой — ад падлеткаў да пенсіянераў! — спаборнічалі ў розных гумарыстычных жанрах: пародыі, песні, маналога, клаунадзе і г. д.

Падобную скіраванасць меў і ўкраінскі праект **«Рассмяшы коміка»**, які ў 2014 годзе часова атрымаў беларускую «прапіску» і выйшаў на АНТ. Галоўнай задачай яго ўдзельнікаў было рассмяшыць або хоць бы выклікаць усмешку ў прафесійных гумарыстаў, а галоўным прызам — 50 мільёнаў рублёў. Яшчэ адным вынікам супрацоўніцтва АНТ з украінскім тэлебачаннем стала забаўляльная праграма **«Вячэрні Мінск»** (адаптаваны пад беларускія рэаліі аналаг папулярнага шоу «Вячэрні Кіеў») з вядучымі Люцыяй Лушчык і Андрэем Бондам, якія ў тэлесезоне 2013—2014 усяляк кпілі з айчынных «зорак» эстрады, разыгрывалі артыстаў, спартсменаў, тэлевядучых і нават палітыкаў, правяралі пачуццё гумару гараджан у правакацыйных вулічных апытаннях і наогул бесперапынна весялілі гасцей і гледачоў.

У 2015 годзе маладзёжны тэлеканал «Беларусь 2», інтэгруючыся з інтэрнэт-рэальнасцю, прадставіў гледачам гумарыстычную праграму **«Кіпень»**, вядучы якой Канстанцін Каверын дзе па-добраму, а дзе і даволі з'едліва каментаваў забаўныя відэа з сусветнага павуціння, а таксама аўтарскія ролікі, дасланыя гледачамі. Праект пражыў у эфіры два сезоны, а сёлета — дарэчы, ужо зусім хутка, 3 красавіка — яму на змену прыйдзе гумарыстычны відэаблог «Кіслы comment». «Гэта серыя міжпраграмных ролікаў, у якіх вядучы «Двойкі» Паша Кіслы будзе каментаваць сюжэты нашых гледачоў, знятыя на мабільныя тэлефоны», — расказалі ў тэлекампаніі. Даслаць свае сюжэты кожны ахвотны зможа на афіцыйнай старонцы тэлепраграмы «Пін_код» у сацыяльнай сетцы «УКантакце», а ўжо каму з аўтараў дастануцца кампліменты, а каму — крытычныя заўвагі, пакажа час.

Акрамя таго, з мінулага года і па цяперашні час на АНТ выходзіць **тэлечасопіс «Гумарынка»** — своеасаблівы беларускі адказ «Ералашу», прыдуманы і рэалізаваны мастацкім кіраўніком тэатра «Хрыстафор» Яўгенам Крыжаноўскім, які адкрыў дзіцячую тэатральную студыю «Гумарынка» і заснаваў аднайменны фестываль дзіцячага гумару, які неўзабаве адбудзецца ўжо другі раз.

...Безумоўна, гэта далёка не поўны спіс тэлепраграм, якія нас забаўлялі і будуць смяшыць надалей. Галоўнае, каб нагоды для весялосці не пераваліся.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
*tselyashuk@zviazda.by*

**Фота з архіваў тэлеканалаў**

■

■ Сядзі і глядзі

# Кожнаму па прызначэнні

Што: **«ВУСАТЫ НЯНЬ»**
Калі і дзе: **МІР, 5 красавіка ў 9.25**



Учарашні школьнік, а цяперашні вісус і патэнцыйны прызыўнік Кеша ўпарта не хоча сталець і браць на сябе ўсе клопаты і абавязкі дарослага чалавека, а таму надоўга не затрымліваецца ні на адной працы, затое добра знаёмы з участковым. Ну, што з такім рабіць? Хіба што... адправіць у дзіцячы садок, памочнікам выхавальніка? Так бы мовіць, у парадку эксперыменту. Хто б мог уявіць, што менавіта гэта рашэнне стане самым правільным і «маленькія бармалейчыкі» такі зробяць з гультая і хулігана Кешы Чацвяргова добрага, адказнага і дарослага Інакенція Пятровіча, які здолеў не толькі знайсці сябе справу, якая падабаецца, але і заразіць уласным імпэтам сяброў.

Цікавы факт: выхад першай поўнаметражнай работы рэжысёра Уладзіміра Граматыкава супаў з прыняццем у 1977 годзе новай, так званай брэжнеўскай, Канстытуцыі СССР, якая прадугледжвала ўзмацненне «народнага кантролю» ў многіх сферах жыцця. У фільме ж лёс абібока Кешы абмяркоўваўся якраз на пасяджэнні грамадскага Камітэта народнага кантролю.

Што: **«ВАРАТАР»**
Калі і дзе: **«Беларусь 3», 8 красавіка ў 16.00 і 21.05**



Чорна-белы фільм 1936 года, зняты паводле рамана Льва Касіля, расказвае пра лёс тыпова «простага савецкага хлопца» Антона Кандзідава. Малады волжскі грузчык, заняты на сельгасработах — дапамагае перавозіць па рацэ ўраджай кавуноў, — адметны рэдкай лоўкасцю і спрытам. Аднойчы нехта заўважае, што з такім прыроджаным талентам хлопец мог бы стаць футбольным варатаром, — і той загараецца марай трапіць у вялікі спорт. На гэтым шляху Антона, безумоўна, чакаюць не толькі поспехі і перамогі, але і горкія расчараванні — аднак, паколькі фільм зняты ў жанры камедыі, аптымістычная і жыццесцвярджальная канцоўка тут сама сабой зразумелая.

Што цікава, у свой час у гэтай стужцы — у сцэнах футбольных матчаў — зняліся гульцы кіеўскага клуба «Дынама» практычна ў поўным складзе.

Што: **«МЯСНІК, КУХАР І МЕЧАНОСЕЦ»**
Калі і дзе: **АНТ, 9 красавіка ў 0.00**



Мяснік Шао Саньлян заказаны ў прыгажуню-куртызанку Мэй Нян і марыць завараваць яе сэрца, але тая адмаўляе яму ў прыхільнасці. Засмучаны герой нават вырашаецца звесці рахункі з жыццём, але тут у яго рукі выпадкова трапляе казачны двусечны клінок, што пабываў таксама ў руках адзінокага кухара, які марыў адпомсціць за сваю сям'ю, і сына вялікага воіна, які імкнуўся перасягнуць бацьку... Вам страшна? А між тым гэты фільм сумеснай вытворчасці кінематаграфістаў Кітая, Ганконга і ЗША — не толькі баявік, але і камедыя. Пафас гісторыі разбаўляюць анімацыйныя элементы, традыцыйныя азіяцкі сімвалізм і тэатралізацыя перамяшаны з гумарам і сатырай, а рытуальныя танцы — з кітайскім рэпам... Для ўспрымання ўвесь гэты кактэйль даволі складаны, але, чаго не адняць, зачаравальна прыгожы і прыцягальны ■

## Панядзелак, 3 красавіка

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.40** Зона Х.
**9.10** Галоўны эфір.
**10.20** Клуб рэдактараў.
**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.05, 13.10 Меладрама «Палавінкі немагчымага».***
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 16.30 Серыял «Сваты-5».***
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20** Арэна.
**20.00** «Форум» з Дзмітрыем Бачковым.
**21.00** Панарама.
**21.45** «Справа жыцця». Дак. фільм.
**22.00 Серыял «След».*****
**0.15** Дзень спорту.
**0.30 Серыял «Жыць спачатку».*****

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.10 Фільм для дзяцей «Прынцэса на гарошыне».**
**10.05, 18.40, 22.30** Тэлебарометр.
**10.40** Капейка ў капейку.
**11.15** Кіслы comment.
**11.20 Серыял «Шчаслівыя разам-4».*****
**13.10** «Каханне анлайн». Рэаліці-шоу.
**14.20** Рэпарцёр.
**15.05** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**16.15** «Універ-шэф».
**16.50 Фантастыка «Цёмны свет. Раўнавага».***
**19.15** Суперлато.
**20.10** «Сям'я». Рэаліці-шоу.
**21.20, 22.05** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**22.00** КЕНО.
**22.35** «Вярніце мне прыгажосць». Медыцынскае рэаліці.
**23.45** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабрананак».
**7.35** «Беларуская кухня». Бульбяная каўбаса з падліўкай.
**8.00, 12.00, 20.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.15, 12.15, 20.25, 23.35** «Гэты дзень».
**8.20** «Майстры і куміры». Народны артыст Беларусі, народны артыст СССР Генадзь Аўсяннікаў.
**9.15, 12.55 «Дзівакі». Камедыя.***
**10.35** «Навукаманія».
**11.00** «Гітара па крузе».
**12.20, 20.30** «Мастацтва Беларусі — 1963» (ліпень).
**12.30** «Наперад у мінулае».
**14.15** «Выйсце ёсць». Вадзім Дзявятоўскі.
**14.40** «Песні мінулага стагоддзя». Канцэрт памяці Уладзіміра Мулявіна.
**15.35, 21.05** «Дыверсанты Трэцяга рэйха». «Незавершаны скачок».*
**16.10, 21.40 «Супрацьстаянне». Серыял. 1-я серыя.*****
**17.15, 22.50 «Цень самурая». Дэтэктыў. 1-я серыя.***
**18.10** «Ваенныя гісторыі любімых артыстаў». Фільм першы.*
**18.50** «Тэатр у дэталях». Спектакль Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы «Выкраданне Еўропы».
**19.15** «Спаткание сяброў». Канцэрт з удзелам фальклорнага гурта «Купалінка», ансамбля «Прымакі», ансамбля «Калінка», групы «Спадчына», Дзяржаўнага ансамбля танца Беларусі.
**20.40** «Калыханка».

### Беларусь 5

**8.00** Аўтаспорт. Формула-Е. Гран-пры Мексікі.
**9.10** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. 1/8 фіналу. Матч у адказ. «Фленсбург» (Германія) — БГК імя Мяшкова (Беларусь).
**10.40** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. 1-ы тур. «Крумкачы» Мінск) — ФК «Віцебск».
**12.25** Хакей. КХЛ. Заходняя канферэнцыя. Фінал. Шосты матч. «Лакаматыў» (Яраслаўль) — СКА (Санкт-Пецярбург).
**14.20** Фактар сілы.
**14.50** Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. «Цмокі-Мінск» — «Парма» (Перм).
**16.30** Тэніс. Турнір WTA. Маямі. Фінал.
**18.35** Час футбола.
**19.20** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. Фінал. Шосты матч. «Нёман» (Гродна) — «Юнацтва-Мінск». (У перапынках — PRO спорт. Навіны.)
**21.35** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. 58 кг.
**23.10** PRO спорт. Вынікі тыдня.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.00** «Жыць здорава!»
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.15, 16.20** «Час пакажа».
**16.55** «Давай пажэнімся!»
**18.20** «Кантрольная закупка».
**19.00** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05** «Справа прынцыпу».
**22.15** «Усё складзецца».
**22.55** «Вячэрні Ургант».
**23.30** «Раманавы».
**1.20** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.25** «Вялікае снеданне».
**10.05** «Усім па катку».
**10.45, 0.00 «Белыя ваўкі». Серыял.**
**12.30, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** «Самая карысная праграма».
**14.45** «Рамонт па-сумленнаму».
**15.25** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**16.50** «Вялікі горад».
**18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Ваенная тайна».
**23.05** «Тайны Чапман».
**1.35** «Соль». Музычнае шоу.

### МІР

**6.00** М/ф «Маша і Мядзведзь».0
**7.30** Добрай раніцы, свет!
**9.00 Серыял «Дачаснік», 1—2-я серыі.*****
**12.30** «Любімыя акцёры». Любоў Палішчук.
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Няма праблем!»***
**14.55** Дак. фільм «Сямейныя драмы».***
**16.15 Серыял «Вяртанне Мухтара».*****
**19.20, 4.20 Серыял «Закон і парадак».*****
**22.10 Маст. фільм «Здзелка».*****
**0.15 Серыял «Спрут».*****
**2.10 Серыял «Гарачы лёд».*****

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Карціна свету».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** Ток-шоу «Што адбываецца».
**12.50** «Пакой смеху».
**13.35** «Наша справа».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.20** Серыял «Скліфасоўскі».
**19.15, 20.40 Серыял «Леднікаў».**
**22.00, 23.10 Серыял «Пасведчанне аб нараджэнні».**
**0.05** «Спецыяльны карэспандэнт».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.05** «НашСпажыўНагляд».
**7.10, 8.05 Серыял «Час Волкава».*****
**8.55 Серыял «Мухтар. Новы след».*****
**9.45** «За мяжой».
**10.20 Серыял «Ляснік».*****
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25, 16.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05** «Новыя рускія сенсацыі».
**15.00** «Ты не паверыш!»
**17.00, 19.45 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».*****
**18.00** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**21.25 Серыял «Кансультант».*****
**23.10** «НЗ.by».
**23.30** «Вынікі дня».
**0.00** «Пазнякоў».
**0.10 Серыял «Дэманы».*****

### 8 канал

**7.00** Раніца на «Восьмым».
**11.00 Маст. фільм «Жамчужына Ніла».*****
**12.50, 19.25 Серыял «Каралеўства».**
**14.15 Фантастыка «Людзі ў чорным».*****
**15.45, 19.20, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**15.50** Мультпарад. «Апошні з магікан».
**17.00 Серыял «Каўчэг».**
**18.20 Серыял «Лэдзі-дэтэктыў».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Трылер «Вялікі ўраўняльнік».*****
**23.10 Серыял «Ведзьмы Усходняга ўзбярэжжа».**

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер».
**7.00, 3.25** М/ф «Смяшарыкі».
**7.20, 3.45** М/ф «Фіксікі».
**7.40, 4.05** М/ф «Маша і Мядзведзь».
**8.00, 4.25** «Ералаш».
**8.30, 16.50** Серыял «Варонiны».
**9.40** Камедыя «Нянькі».
**11.40** Скетч-шоу «6 кадраў».
**12.00, 5.10** Серыял «Я лячу».
**13.00** «Паспець за 24 гадзіны».
**14.10** «Сэрцы за каханне».
**14.50** «Узважаныя людзі».
**18.00, 23.20** «Уральскія пельмені».
**19.00** Серыял «Маладзёжка-4».
**20.10** Серыял «Кухня-5».
**21.20** Меладрама «Каханне і іншыя непрыемнасці».
**0.00** Серыял «Закрытая школа».
**1.00** Серыял «Бязмоўны сведка».
**1.50** Серыял «Месяц».
**2.40** «Не можа быць!»

### Культура

**7.00** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 0.10** Навіны культуры.
**10.15, 1.40** «Назіральнік».
**11.15** «Бібліятэка прыгод».
**11.30** «Дон Жуан». Маст. фільм.
**13.10** «Лінія жыцця». Валянціна Цялічкіна.
**14.00, 22.25, 2.40** Сусветныя скарбы.
**14.15** «Юрый Нагібін. Бераг трамвая». Дак. фільм.
**15.10** «80 гадоў Марку Разоўскаму. «Кафедра». Тэлеспектакль. Запіс 1982 года.
**17.25** «Тысяча крокаў Марка Разоўскага». Дак. фільм.
**18.05** А. Вівальдзі. «Поры года». Ільгя Грынгольц, Аляксей Уткін і Дзяржаўны акадэмічны камерны аркестр Расіі.
**18.45** «Італьянскае шчасце». Дак. фільм.
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** «Саці. Нясумная класіка...»
**20.45** «Развод па-італьянску». Маст. фільм.
**22.40** Прыступкі цывілізацыі. «Медычы. Хросныя бацькі Рэнесансу». Дак. серыял. 1-я серыя.
**23.40** Да 85-годдзя з дня нараджэння Андрэя Таркоўскага. «Асколкі люстэрка». Фільм 1-ы.
**0.25** Мастсавет.
**0.35** «Кінескоп». «Італьянскі дзённік».
**1.15** Д. Шастаковіч. Канцэрт №2 для фартэпіяна з аркестрам.

### Настальгія

**6.00, 0.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1967. 2008 год.***
**7.00, 17.05, 18.55, 21.40, 23.00, 1.10, 2.40, 3.40, 5.45** Музычная настальгія.*
**7.15** «КВЗ-87». НДУ — ДДУ.***
**9.00** «Быў час». 2009 год.***
**9.55** «Пена». Фільм-спектакль Маскоўскага тэатра Сатыры. Пастаноўка В. Плучака.***
**12.00** Праграма «Вясёлыя рабяты». «Пра госці не спрачаюцца». 1982 год.***
**13.10** «Праграма А». 1989 год.*
**15.00** Маст. фільм «Старэйшы сын».***
**17.35** «Час пік» з У. Ліцьевым. 1994 год.*
**18.00** The Best of «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым. 2006 год.****
**19.05** Дак. фільм «Нефармалы кідаюць выклік».****
**19.40** Маст. фільм «Арыэль».****
**21.00, 3.00** «Мінулы час».*
**22.00** «Народжаныя ў СССР».*
**1.40** Тэлеспектакль «Гадзіннік з зязюляй».***
**4.00** «Колба часу».***
**5.00** «Песня-82». 2-я частка.*

### EuroSport 1

**2.00, 6.30, 1.00** Супербайк. Этап чэмпіянату свету.
**2.30, 5.00, 11.30, 15.00** Веласпорт. «Тур Фландрыі».
**4.00, 13.00** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету.
**7.30, 18.15, 20.15** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы.
**9.30** Ралі. ERC.
**10.00** Снукер. China Open. Фінал.
**12.55** Зімовыя віды спорту. «У пагоні за гісторыяй».
**16.30** Веласпорт. «Тур краіны баскаў».
**23.00** Конны спорт. Кубак свету.
**0.05** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**0.30** Футбол. «ФІФА».

### Кінакамедыя

**0.15** «Анж і Габрыель». Камедыя.***
**1.55** «Леа і Беа». 1-я серыя. Камедыя.***
**5.10** «Модная штучка». Камедыя.*
**7.00** «Чужое вяселле». Камедыя.***
**8.40** «Я не ведаю, як яна робіць гэта». Камедыя.***
**10.20** «Старая добрая оргія». Камедыя.***
**12.10** «ЗащитнеГ». Камедыя.****
**14.00, 14.50, 15.40** «Паміж намі». Скетчкам.***
**14.20, 15.10** «Камедыянты (шоу)».***
**16.00** «Тата напракат». Камедыя.*
**17.50** «Стаўка на каханне». Меладрама.*
**19.30** «Турэцкая для пачаткоўцаў». Камедыя.***
**21.25** «Сардэчна запрашаем у джунглі». Прыгоды.*
**23.10** «Эльза і Фрэд». Камедыя.*

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.05** «Доктар І...»
**8.35** «20 хвілін». Серыял. Заключная серыя.
**10.15** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**11.55** «Асцярожна, махляры!»
**12.25** «Без падману».
**13.15** «Дом Сонца». Драма.***
**15.00** «Дзікія грошы».
**15.50** «Спатканне з зоркай».
**17.00** «Балерына Вялікага. Помста сцэны». Дак. фільм.
**18.10** «Тайны следства». Серыял.
**19.10, 3.30** «Вузел лёсу». Серыял.
**21.05, 2.50** «Ежа, я люблю цябе».
**21.55** «Рэвізора».
**23.20** «Развітанне».
**0.05** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.50** «Двое — гэта занадта». Камедыя.***
**5.05** «Часова даступны».

### ТБ1000

**6.10, 18.15** Працячка.***
**8.05** Двайное жыццё Чарлі Сан-Клаўда.***
**9.55** Як злавіць монстра.****
**11.45** Начны цягнік да Лісабона.***
**13.50** Лабірынт Фаўна.***
**16.10** Сцежкі.***
**20.10** Крануты прафесар.*
**22.10** Джо.***
**0.25** Адна сустрэча.***
**2.10** Ева: штучны розум.*
**4.05** Правілы здыму: метад Хітча.*

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Знаходка.****
**8.25** Сіндром Пятрушкі.***
**10.35** Пацалунак скрозь сцяну.***
**12.35** Старое добрае кіно. На залатым ганку сядзелі.*
**14.20** Сірата казанская.
**16.15** Палонны.***
**18.10** Маскоўскі жыгала.****
**20.20** Пах верасу.***
**22.15** 30 спатканняў.***
**0.10** Яраслаў. Тысячу гадоў таму.***
**2.15** Тарас Бульба.***
**4.30** Выкрутасы.*

### National Geographic

**6.00, 13.10** Гульні розуму.*
**6.50** Навуковыя недарэчнасці.*
**7.35, 10.45, 14.40** Мегазаводы.*
**8.25, 15.30** Міжнародны аэрапорт Дубай.***
**9.10, 12.20, 18.40, 21.50, 1.50, 5.10** Марс.*
**10.00** Паранармальнае.***
**11.35, 16.15, 19.30, 23.25, 2.35** Расследаванні авіякатастроф.*
**17.50, 21.00, 0.55, 4.15** Гісторыя Бога з Морганам Фрыменам.***
**20.15** Чалавек супраць YouTube.*
**22.40** Прарыў 2.***

### Discovery

**8.00, 14.00** Залатая ліхаманка.***
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена?*
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена?*
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Склады.*
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Бітва за нерухомасць.*
**11.00** Выжыць разам.***
**17.00, 22.00, 2.55** Вялікі махінатар.*
**18.00** Траса Калыма.*
**19.00** Ратавальнікі Эверэста.***
**20.00** Аляска: сям'я з лесу.***
**0.00, 3.50** Выжыць любой цаной.*
**1.00, 6.20** Не спрабуйце паўтарыць.***
**2.00, 4.40** Маланкавыя катастрофы.***

**0 — без узроставых абмежаванняў; * — дзецям да 12 гадоў прагляд фільма дазволены ў суправаджэнні бацькоў або педагога; ** — дзецям да 14 гадоў прагляд фільма дазволены ў суправаджэнні бацькоў або педагога; *** — фільм дазволены для паказу гледачам, старэйшым за 16 гадоў; **** — фільм дазволены для паказу гледачам, старэйшым за 18 гадоў; Э18 — эратычны фільм, дазволены для паказу гледачам ад 18 гадоў.**

## Аўторак, 4 красавіка

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.20** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.45** Зона Х.
**9.10, 22.00 Серыял «След».***
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00** Дзіцячы доктар.
**11.35, 12.10, 20.00 Серыял «Практыка».***
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».***
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Жанчына ў бядзе-3». 1-я серыя.***
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.00** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** «Справа жыцця». Дак. фільм.
**0.35** Дзень спорту.
**0.50 Серыял «Жыць спачатку».***

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 22.45** Тэлебарометр.
**9.05, 18.00 Серыял «Каханне і іншыя недарэчнасці...» 1—2 серыі.***
**11.10, 17.00 Серыял «Анжаліка». 1—2-я серыі.***
**12.15, 19.50** «Тата папаў». Сямейнае рэаліці-шоу.
**14.05, 21.35, 22.10** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**15.20, 23.45** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.05, 22.50 Трылер «Тут нехта ёсць...» 1-я серыя.***
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**0.30** «Анлайн». Скетчкам.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабранранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Бабенікі.
**8.00, 12.00, 20.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.15, 12.15, 23.35** «Гэты дзень».
**8.20, 18.40 «Галіна». Драма. 1-я серыя.***
**9.15, 12.45 «Настальгія». Драма.***
**11.15, 15.15 «Чыста англійскія забойствы». Дэтэктыў. «Да самай смерці». 1-я серыя.***
**12.20** «Легенды беларускай эстрады». «Музыка зорак». Тамара Раеўская.
**14.50** «Выйсце ёсць». Расціслаў Крымер.
**16.05, 21.05** «Дыверсанты Трэцяга рэйха». «Жывыя тарпеды».*
**16.45, 21.45 «Супрацьстаянне». Серыял.***
**17.40, 22.40 «Цень самурая». Дэтэктыў.***
**19.30** «Ваша лато», «Пяцёрачка».
**20.15** «Старыя казкі».
**20.40** «Калыханка».

### Беларусь 5

**8.00, 22.00** Тэніс. Турнір WTA. Чарльстон.
**12.05** Хакей. КХЛ. Усходняя канферэнцыя. Шосты матч. «Ак Барс» (Казань) — «Металург» (Магнітагорск).
**14.00** Час футбола.
**14.45** PRO спорт. Вынікі тыдня.
**15.30** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. Фінал. Шосты матч. «Нёман» (Гродна) — «Юнацтва-Мінск».
**17.30** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**18.00** Спорт-кадр.
**18.30** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. 63 кг.
**19.30** Хакей. КХЛ. Заходняя канферэнцыя. Фінал. Сёмы матч. СКА (Санкт-Пецярбург) — «Лакаматыў» (Яраслаўль). (У перапынках — PRO спорт. Навіны.)

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!»
**10.15** «Смак».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.15, 16.20** «Час пакажа».
**16.55** «Давай пажэнімся!»
**18.20** «Кантрольная закупка».
**18.55** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Мата Хары».***
**23.00** «Вячэрні Ургант».
**23.35 Серыял «Салам, Масква».****
**0.35** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.25** «Тайны Чапман».
**9.30, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.45, 0.15 «Белыя ваўкі». Серыял.**
**12.30, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50 Маст. фільм «Туз у рукаве».***



**15.45** «Вадзіць па-руску».
**16.00** «Следакі».
**16.50** «Цэнтральны рэгіён».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Тэрыторыя памылак».
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.05** «Аўтапанарама».

### МІР

**6.50** М/ф «Маша і Мядзведзь».0
**7.30** Добрай раніцы, свет!
**9.00 Серыял «Дачаснік».***
**12.30** «Любімыя акцёры». Алег Даль.
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Няма праблем!»***
**14.55** Дак. фільм «Сямейныя драмы».***
**16.15 Серыял «Вяртанне Мухтара».***
**19.20, 4.05 Серыял «Закон і парадак».***
**22.10 Маст. фільм «Арфа для каханай».***
**23.55 Серыял «Спрут».***
**1.55 Серыял «Гарачы лёд».***

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.45** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.10** «Пакой смеху».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.20 Серыял «Скліфасоўскі».**
**19.15, 20.40 Серыял «Леднікаў».**
**21.40** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**22.00, 23.10 Серыял «Пасведчанне аб нараджэнні».**
**0.05** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.05** «Двайныя стандарты».
**7.10, 8.05 Серыял «Час Волкава».***
**8.55 Серыял «Мухтар. Новы след».***
**9.45, 23.10** «НЗ.by».
**10.20 Серыял «Ляснік».***
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25, 16.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «Дарожны патруль».***
**17.00, 19.45 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».***
**18.00** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**21.25 Серыял «Кансультант».***
**23.30** «Вынікі дня».
**0.00 Серыял «Дэманы».***

### 8 канал

**7.00** Раніца на «Восьмым».
**10.30** «Мой любімы гадаванец».
**11.00 Трылер «Страказа».***
**12.50, 19.20 Серыял «Караляеўства».**
**14.20 Фантастыка «Людзі ў чорным-2».***
**15.45, 19.15, 21.00, 23.50** «Надвор'е».
**15.50** Мультпарад. «Апошні з магікан».
**17.00 Серыял «Каўчэг».**
**18.20 Серыял «Лэдзі-дэтэктыў».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.15 Маст. фільм «У сэрцы мора».***
**23.10 Серыял «Ведьмы Усходняга ўзбярэжжа».**

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер».
**6.30, 16.20** Серыял «Татавы дочкі».
**7.00, 3.25** М/ф «Смяшарыкі».
**7.20, 3.45** М/ф «Фіксікі».
**7.40, 4.05** М/ф «Маша і Мядзведзь».
**8.00, 4.25** «Ералаш».
**8.30, 16.50** Серыял «Варонины».
**9.40** Камедыя «Уяві сабе».
**11.40** Скетч-шоу «6 кадраў».
**12.00, 5.10** Серыял «Я ляччу».
**13.00** «Паспець за 24 гадзіны».
**14.00, 20.10** Серыял «Кухня-5».
**15.10, 19.00** Серыял «Маладзёжка-4».
**18.00, 23.20** «Уральскія пельмені».
**20.10** Серыял «Кухня-5».
**21.20** Мюзікл «Прагулка па сонечным святле».
**0.00** Серыял «Закрытая школа».
**1.00** Серыял «Бязмоўны сведка».
**1.50** Серыял «Месяц».
**2.40** «Не можа быць!»

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 0.10** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15** «Развод па-італьянску». Маст. фільм.
**13.00** Сусветныя скарбы.
**13.15, 22.40** «Медычы. Хросныя бацькі Рэнесансу». Дак. серыял.
**14.15** «Свет і гармонія Леаніда Пастэрнака». Дак. фільм.
**15.10, 0.30** «Следства вядуць знаткі». Тэлефільм.
**16.40** «Сацi. Нясумная класіка...»
**17.25** Рэпартажы з будучыні. «Разумныя дамы». Дак. фільм.
**18.05** Арыі з опер Дж. Вердзі, Дж. Пучыні. Марыя Гулегіна, аркестр і хор Маскоўскага акадэмічнага музычнага тэатра імя К.С. Станіслаўскага і У.І. Неміровіча-Данчанкі.
**19.05** «Роберт Фолкан Скот». Дак. фільм.
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** Штучны адбор.
**20.45** «Дзень савы». Маст. фільм.
**22.30** «Антоніа Сальеры». Дак. фільм.
**23.40** «Асколкі люстэрка».
**0.25** Мастсавет.

### Настальгія

**6.00** Праграма «Вясёлыя рабяты». «Пра густы не спрачаюцца». 1982 год.***
**7.10** «Праграма А». 1989 год.*
**9.00** Маст. фільм «Старэйшы сын».***
**11.05, 12.55, 15.40, 17.05, 18.55, 20.35, 21.40, 23.00, 1.00** Музычная настальгія.*
**11.35** «Час пік» з У. Лісцьевым. 1994 год.*
**12.00** The Best of «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым. 2006 год.****
**13.05** Дак. фільм «Нефармалы кідаюць выклік».****
**13.40** Маст. фільм «Арыэль».****
**15.00, 21.00** «Мінулы час».*
**16.00, 22.00** «Народжаны ў СССР».*
**18.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Вясновы заклік». 2007 год.*
**19.30** Маст. фільм «Падкідыш».***
**0.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1967. 1-я частка. 2008 год.***
**1.15** «КВЗ-87». НДУ — ДДУ.***
**3.00** «Быў час». 2009 год.***
**3.55** «Пена». Фільм-спектакль Маскоўскага тэатра Сатыры. Пастаноўка В. Плучака.***

### EuroSport 1

**2.00, 12.00** Watts.
**2.30, 7.30, 13.05, 18.15, 20.15** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы.
**4.00, 10.35, 15.30** Веласпорт. «Тур краіны баскаў».
**5.00** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету.
**7.00** Аўтаспорт. Серыя WTCC.
**9.30** Фехтаванне. Серыя Гран-пры.
**13.00** Зімовыя віды спорту. «У пагоні за гісторыяй».
**15.05** Супербайк. Этап чэмпіянату свету.
**23.00** «Найлепшае з коннага спорту».
**23.35** Формула Е.
**0.30** Аўтаспорт. Серыя Blancpain.
**1.05** Ралі ERC.
**1.30** Конны спорт. Кубак свету.

### Кінакамедыя

**1.10** «Дробныя махляры». Камедыя.*
**2.55** «Як украсці брыльянт». Камедыя.***
**4.40** «Я ніколі не буду тваёй». Меладрама.***
**6.30** «Па версіі Барні». Камедыя.***
**8.50** «Леа і Беа». Камедыя.***
**12.00** «Гульня ў чатыры рукі». Камедыя.***
**14.00, 14.50, 15.40** «Паміж намі». Скетчкам.***
**14.20, 15.10** «Камедыянты (шоу)».***
**16.00** «Тата напракат». Камедыя.*
**17.50** «Навагодняя жонка». Камедыя.***
**19.30** «Самы лепшы дзень». Камедыя.***
**21.25** «Адной левай». Камедыя.*
**22.55** «Я не ведаю, як яна робіць гэта». Камедыя.***

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.35** «Ёсць адзін сакрэт».
**8.00** «Доктар І...»
**8.30, 19.00, 3.00** «Вузел лёсу». Серыял.
**10.10, 4.30** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**11.50** «Сляпая».
**12.50** «Варажбітка».
**13.55** «Паралельны свет».
**14.50** «Вайна нявест».
**15.20** «Здзелка».
**15.45** «Натуральны адбор».
**16.40, 21.50** «Рэвізора».
**18.00** «Тайны следства». Серыял.
**20.50** «Ведзьмакі свету».
**23.10** «Гісторыі выратавання».
**23.40** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.25** «Пятае вымярэнне». Фантастыка.***
**2.15** «Амерыканскі жаніх».

### ТБ1000

**6.10, 18.10** Вялікія вочы.***
**8.15** Джо.***
**10.30** Адна сустрэча.***
**12.10** Кранутыя прафесар.*
**14.05** Правілы здыму: метад Хітча.*
**16.20** Ева: штучны розум.*
**20.10** Кранутыя прафесар-2. Сям'я Клампаў.***
**22.20** Дарагі Джон.***
**0.30** Прыстрэль іх.****
**2.10** Целаахоўнік.****
**4.20** Прывіды былых сяброўак.***

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** 30 спатканняў.***
**8.15** Пах верасу.***
**10.20** Яраслаў. Тысячу гадоў таму.***
**12.25** Дзень Н. Адной левай.*
**14.15** Дзень Н. Курьер з «Раю».*
**16.20** Дзень Н. Мужчына з гарантыяй.***
**18.15** Дзень Н. Гараскоп на ўдачу.*
**20.20** Дзень Н. Кухня ў Парыжы.*
**22.30** Дзень Н. Найлепшы дзень.***
**0.40** Дзень Н. Клетка.***
**2.45** Неадэкватныя людзі.***
**4.35** Пра што гавораць мужчыны.***

### National Geographic

**6.00, 13.15, 17.50, 21.00, 0.50, 3.55** Гульні розуму.*
**6.50, 5.35** Навуковыя недарэчнасці.*
**7.35, 10.50, 14.45** Мегазаводы.*
**8.25, 15.35** Міжнародны аэрапорт Дубай.***
**9.10** Гісторыя Бога з Морганам Фрыменам.***
**10.05** Паранармальнае.***
**11.40, 16.20, 19.25, 23.20, 2.25** Расследаванні авіякатастроф.*
**12.25, 18.40, 21.45, 1.35, 4.45** Марс.*
**20.15** Чалавек супраць YouTube.*
**22.35** Прарыў 2.***

### Discovery

**8.00, 14.00** Залатая ліхаманка.***
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена?*
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена?*
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Склады.*
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Бітва за нерухомасць.*
**11.00** Мяцежны гараж.***
**17.00, 22.00, 2.55** Вялікі махінатар.*
**18.00** Махінатары.*
**19.00** Браты Дызель.***
**20.00** Хуткія і гучныя.***
**0.00, 3.50** Выжыць любой цаной.*
**1.00, 6.20** Не спрабуйце паўтарыць.***
**2.00, 4.40** Маланкавыя катастрофы.***



# Лепш лі́таваць, чым лямантаваць

**Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» гульня «Размаўляем па-беларуску». Для таго каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт tvrgomel.by або 3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Ну, а праверыць сваё веданне роднай мовы пасля таго, як праграма выйшла ў эфір, можна з дапамогай «Звязды». Ці ведалі вы, што:**

**Ляманта́ваць** — моцна і працяжна крычаць, плакаць.

**Вíго́нь** (шматзначнае) — жывёліна сямейства лам з тонкай і мяккай шэрсцю. Слова паходзіць з французскай мовы.

**Ляпіс** — парашок, які выкарыстоўваецца ў медыцыне для прыпякання. Паходзіць слова ад лацінскага lapis — камень.

**Бро́вар** — пабудова, дзе варылі піва, гналі гарэлку. На Беларусі бровар — той самы вінакурны завод, вядомы з XVI стагоддзя.

**Нястá́ча** — адсутнасць чаго-небудзь у неабходнай колькасці. «Грудзі распірала ад нястачы паветра», — чытаем у Васіля Быкава.

**Лі́таваць** — берагчы каго-небудзь, шкадаваць. Пры ўжыванні правільна ставім націск, таму што ёсць яшчэ ўстарэлае слова літаВаць — што значыць паяць.

**На пазногаць** — 1) вельмі мала, трошачкі, ледзь-ледзь; 2) ніколі, зусім (не даваць, не рабіць, не даравать). Беларускія сінонімы: на макава зерне, на волас. Рускія адпаведнікі: нічагошенькі, на ломаный грош.

**Далёка пайсці** — дабіцца поспеху, дасягнуць многага. Беларусы яшчэ скажуць: пайсці ў гору, прабіць дарогу. Рускія: выбиться в люди, выйти на орбиту.

**Чарговыя выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» раніцай кожную суботу.**

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*astashkevich@zviazda.by*

■ Тэлесеткі

# СА СЦЭНЫ — НА ЭКРАН

**У Міжнародны дзень тэатра ў эфіры сацыякультурнага тэлеканала «Беларусь 3» гледачы ўбачылі спектакль «Пінская шляхта» Палескага драматычнага тэатра, літаральна на пачатку сакавіка запісаны прадзюсарскім цэнтрам Белтэлерадыёкампаніі.**

Як расказалі «Звяздзе» ў прэс-службе холдынга, гэта быў не адзінкавы тэатральны паход, а пачатак вялікага праекта «Легенды беларускай сцэны», у межах якога будуць прадстаўленыя запісы найлепшых тэатральных пастановак — як з фонду БТРК, так і сучасных спектакляў.

Так, ужо 2 красавіка тэатральную эстафету падхопіць тэлеверсія балета «Маленькі прынц» (яго запіс адбудзецца сёння ў Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета), а 9 красавіка будзе паказаны архіўны запіс 1989 года — спектакль у дзвюх дзеях «Мілы чалавек» паводле п'есы Кандрата Крапівы. Надалей жа, абяцаюць тэлевізіёнікі, сустрэчы з «Легендамі беларускай сцэны» будуць адбывацца кожную нядзелю.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
*tselyashuk@zviazda.by*

■

## наступны тыдзень

**ШАЛІ.** Вашы планы істотна зменяцца, важнымі стануць адносіны з начальнікам або з падначаленымі. Новыя знаёмствы могуць перарасці ў моцнае і надзейнае сяброўства. У панядзелак, магчыма, давядзецца ахвяраваць сваімі планамі і амбіцыямі на карысць калегі або сябра. У пятніцу зможаце канчаткова пазбавіцца ілюзіям і выправіць памылкі. У суботу смела пазбаўляйцеся ад усяго, што перашкаджае вашаму развіццю і руху наперад.

**СКАРПІЁН.** Тыдзень для вас спрыяльны і прыбытковы практычна ва ўсіх адносінах. Вам многае ўдасца, асабліва калі будзеце працаваць не ў адзіночку, а супольна з іншымі — так і лягчэй і выгадней. Праўда, для гэтага давядзецца час ад часу прыкусваць язык, каб не распужаць партнёраў сваімі не ў меру крытычнымі заўвагамі. Можаце думаць пра навакольных што хочаце, але не аказвайце ціску і пазбягайце ў размовах павучальных інтанацый. Гэта дапаможа захаваць як добрыя адносіны з навакольнымі, так і вашы нервовыя клеткі.

**СТРАЛЕЦ.** Лепш паступіць мудра і спакойна пагрузіцца ў працу, чым абурацца, бо канфлікты ўсё роўна ні да чаго добрага не прывядуць. Магчыма інтэнсіўнае супрацоўніцтва ў новай для вас сферы. Паспрабуйце не прапусціць творчых і працоўных магчымасцяў. Можаце атрымаць каштоўную і своечасовую інфармацыю. Праявіце свае арганізатарскія здольнасці. Першая палова тыдня дазволіць справіцца з многімі назапашанымі праблемамі. У выхадныя выбірайцеся ў госці ці на сямейны шпацыр.

**КАЗЯРОГ.** Надыходзіць даволі ўдалы ў эмацыйным плане тыдзень. Найбольш імаверны яго мінус — магчымая паломка нейкай тэхнікі, хутчэй за ўсё бытавой, але нават гэта не выведзе вас з раўнавагі. У панядзелак сцеражыцеся чужых парад, не выключана, што іх будуць даваць скрыты нядоброзычліўцы. У аўторак будзеце як ніколі лёгкія на пад'ём, але лепш большую частку часу прысвяціць завяршэнню неадкладных спраў. У выхадныя станеце прыемным суразмоўнікам, так што больш гутарыце ў самых розных кампаніях.

**ВАДАЛЕЙ.** На гэтым тыдні на першы план выйдзе праца. З ніадкуль паўстане мноства важных спраў і нечаканых заданняў, ад вас спатрэбіцца шмат намаганняў, каб справіцца з імі, пры гэтым начальства можа так і не ацаніць вашага імпэту. У чацвер здольнасць адэкватна рэагаваць можа значна знізіцца, таму будзьце ўважлівыя. Не прымайце ўсё на веру. У пятніцу вам павінны лёгка ўдавацца справы, звязаныя з праяўленнем асабістай ініцыятывы і прадпрымальнасці. У суботу практычна любая сфера дзейнасці будзе пад сілу.

**РЫБЫ.** Не варта ісці супраць грамадскай думкі, бо даказаць большасці, што вы маеце рацыю, будзе вельмі складана. Лягчэй пагадзіцца на варыянт, які не вельмі вас задавальняе. На працы пажадана засяроджацца на сваіх абавязках. У сераду, як відаць, трэба будзе энергічна вырашаць важныя пытанні, уладжваць праблемы. У пятніцу можаце зарэкамендаваць сябе бліскучым імправізатарам. Мэтанакіраванасць дазволіць дасягнуць значна большых вынікаў, чым вы меркавалі.

## Чацвер, 6 красавіка

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.15** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.40** Зона Х.
**9.10, 22.00 Серыял «След».***
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00** Дзіцячы доктар.
**11.35, 12.10, 20.00 Серыял «Практыка».***
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».***
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Жанчына ў бядзе-3».***
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.00** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** «Справа жыцця». Дак. фільм.
**0.35** Дзень спорту.
**0.45 Серыял «Жыць спачатку». Заключная серыя.***

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 22.45** Тэлебарометр.
**9.05, 18.00 Серыял «Каханне і іншыя недарэчнасці...»***
**11.10, 17.00 Серыял «Анжаліка».***
**12.15, 19.50** «Тата папаў». Сямейнае рэаліці-шоу.
**14.05, 21.35, 22.10** «Паненкасялянка». Рэаліці-шоу.
**15.20, 23.45** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.05, 22.50 Трылер «Тут нехта ёсць...»***
**22.05** Спортлато 6 з 49, КЕНО.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Бігас. Халодны суп.
**8.00, 12.00, 20.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 12.15, 15.00, 20.20, 23.45** «Гэты дзень».
**8.25, 18.40 «Галіна». Драма.***
**9.15** «Час кіно».
**9.25, 13.25 «Каралі для маёй каханай». Кінапрытча.***
**10.35** «Камертон». Стваральнік музычнага фолк-праекта «Ягорава гара» Ігар Архіпаў.
**11.00, 15.05 «Чыста англійскія забойствы». Дэтэктыў. «Смерць на сцэне». 1-я серыя.***
**12.20** «Святло далёкай зоркі». Памяці опернага спевака, народнага артыста СССР Аркадзя Саўчанкі.
**12.45, 20.25** «Мастацтва Беларусі — 1964» (верасень).
**12.55** «Легенды беларускай эстрады». Спадчына Ігара Лучанка.
**14.35** «Выйсце ёсць». Іван Пінігін.
**16.05, 21.05** «Падводная вайна. Л-24». Дак. фільм.*
**16.45, 21.40 «Супрацьстаянне». Серыял.***
**17.50, 22.50 «Цень самурая». Дэтэктыў.***
**19.40** «Музеі Беларусі». Гісторыка-інфармацыйны цэнтр Белпошты.
**20.40** «Калыханка».

### Беларусь 5

**8.00, 9.50** Футбол. Кубак Беларусі. 1/2 фіналу. Першы матч.
**11.45** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. Фінал. Сёмы матч. «Юнацтва-Мінск» — «Нёман» (Гродна).
**13.40** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны. 77 кг. Жанчыны. 69 кг.
**15.50** Слэм-данк.
**16.20** Козел пра футбол.
**16.40** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. 1/8 фінала. Матч у адказ. «Фленсбург» (Германія) — БГК імя Мяшкова (Беларусь).
**18.15** Хакей. КХЛ. Усходняя канферэнцыя. Фінал. Сёмы матч. «Металург» (Магнітагорск) — «Ак Барс» (Казань).
**20.30** Авертайм.
**21.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны. 85 кг.
**22.30** PRO спорт. Навіны.
**22.40** Тэніс. Турнір WTA. Чарльстон.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!»
**10.15** «Смак».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.15, 16.20** «Час пакажа».
**16.55** «Давай пажэнімся!»
**18.20** «Кантрольная закупка».
**18.55** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Мата Хары».***
**22.50** «Вячэрні Ургант».
**23.25 Серыял «Салам, Масква».****
**0.25** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.25** «Тайны Чапман».
**9.30, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.45, 0.15 «Белыя ваўкі-2». Серыял.**
**12.30, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**15.40 «Следакі». Серыял.**
**16.10** «Скардзіцца дазваляецца».
**16.50** «Мінск і мінчане».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Дзіўная справа».
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.05** «Аўтапанарама».

### МІР

**6.40** М/ф «Маша і Мядзведзь».0
**7.30** Добрай раніцы, свет!
**9.00 Маст. фільм «У матросаў няма пытанняў».***
**10.30 Маст. фільм «Ледзяны запал».***
**12.30** «Любімыя акцёры». Ніна Усатава.
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Няма праблем!»***
**14.55** Дак. фільм «Сямейныя драмы».***
**16.15 Серыял «Вяртанне Мухтара».***
**19.20, 4.45 Серыял «Закон і парадак».***
**22.10 Маст. фільм «О, шчаслівчык!»***
**0.00 Маст. фільм «Абдула».***
**2.35 Серыял «Гарачы лёд».***

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.45** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.10** «Пакой смеху».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.20 Серыял «Скліфасоўскі».**
**19.15, 20.40 Серыял «Леднікаў».**
**21.40** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**22.00, 23.10 Серыял «Паведчанне аб нараджэнні».**
**0.05** «Паядынак».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.05** «Дачны адказ».
**7.10, 8.05 Серыял «Час Волкава».***
**8.55 Серыял «Мухтар. Новы след».***
**9.45, 23.10** «НЗ.by».
**10.20 Серыял «Ляснік».***
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25, 16.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «Дарожны патруль».***
**17.00, 19.45 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».***
**18.00** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**21.25 Серыял «Кансультант».***
**23.30** «Вынікі дня».
**0.00 Серыял «Дэманы».***

### 8 канал

**7.00** Раніца на «Васьмым».
**10.45 Драма «Экіпаж».***
**13.00, 19.25 Серыял «Каралеўства».**
**14.25 Камедыя «Хуткі».***
**15.55, 19.20, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**16.00** Мультпарад.
**16.15** «Мой любімы гадаванец».
**16.45 Серыял «Каўчэг».**
**18.15 Серыял «Лэдзі-дэтэктыў».**
**19.10** «Фэшн is my прафэшн».
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.15 Баявік «Шаравая маланка».***
**23.30** М/ф для дарослых.

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер».
**6.30, 16.20** Серыял «Таты дочкі».
**7.00, 3.25** М/ф «Смяшарыкі».
**7.20, 3.45** М/ф «Фіксікі».
**7.40, 4.05** М/ф «Маша і Мядзведзь».
**8.00, 4.25** «Ералаш».
**8.30, 16.50** Серыял «Варонины».
**9.40** Камедыя «Праклён маёй маці».
**11.40** Скетч-шоу «6 кадраў».
**12.00, 5.10** Серыял «Я лячу».
**13.00** «Паспецць за 24 гадзіны».
**14.00, 20.10** Серыял «Кухня-5».
**15.10, 19.00** Серыял «Маладзёжка-4».
**18.00, 23.10** «Уральскія пельмені».
**21.20** Меладрама «Паміж небам і зямлёй».
**0.00** Еўрапейскі покерны турнір.
**0.50** Серыял «Бязмоўны сведка».
**1.50** Серыял «Месяц».
**2.40** «Не можа быць!»

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 0.10** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15** «Сямейны партрэт у інтэр'еры». Маст. фільм.***
**13.15, 22.40** «Медычы. Хросныя бацькі Рэнесансу». Дак. серыял.
**14.15** «Чароўная насмешніца. Цэцылія Мансурава». Дак. фільм.
**15.10, 0.30** «Следства вядуць знатакі». Тэлефільм.
**16.40** «Абсалютны слых».
**17.25** Рэпартажы з будучыні. «Хома Кібарг». Дак. фільм.
**18.05** Нацыянальны сімфанічны аркестр італьянскай тэлерадыёкампаніі RAI і Марка Анджыус.
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
**20.45** «Баль». Маст. фільм.
**23.40** «Асколкі люстэрка».
**0.25** Мастсавет.

### Настальгія

**6.00** «Бый час» з Аляксандрам Паліткогскім: «Вясновы заклік». 2007 год.*
**6.55, 8.35, 9.40, 11.00, 13.05, 14.45, 15.40, 17.05, 19.05, 20.45, 21.40, 23.00, 1.00, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.*
**7.30** Маст. фільм «Падкідыш».***
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час».*
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».*
**12.00** «Спяем, сябры!» з Наталляй Казялковай. 2005 год.***
**13.20** Маст. фільм «Д'Артаньян і тры мушкецёры». 1-я серыя: «Атос, Партос, Араміс і Д'Артаньян».***
**18.00** «Яловая субмарына». «АукцЫон». Як чуецца, так і пішацца».***
**19.25** Маст. фільм «Д'Артаньян і тры мушкецёры». 2-я серыя: «Падвескі каралевы».***
**0.00** The Best of «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым. 2006 год.****
**1.05** Дак. фільм «Нефармалы кідаюць выклік».****
**1.40** Маст. фільм «Арыэль».****

### EuroSport 1

**1.30, 4.00, 6.30, 11.00, 15.35, 23.00, 1.30** Веласпорт. «Тур краіны баскаў».
**2.30, 5.00, 7.30, 13.00, 18.15, 20.15** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы.
**9.35** Watts.
**10.00** Веласпорт. Еўрапейскі тур.
**12.00** Формула Е.
**15.00** Аўтаспорт. Серыя WTCC.
**0.10** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету.

### Кінакамедыя

**1.25** «Я ніколі не буду тваёй». Меладрама.***
**3.15** «Эльза і Фрэд». Камедыя.*
**5.15** «Няправільныя копы». Камедыя.****
**6.50** «Дробныя махляры». Камедыя.*
**8.35** «Гульня ў чатыры рукі». Камедыя.***
**10.35** «Самы лепшы дзень». Камедыя.***
**12.30** «Адной левай». Камедыя.*



**14.00, 14.50, 15.40** «Паміж намі». Скетчкам.***
**14.20, 15.10** «Камедыянты (шоу)».***
**16.00** «Нерэальнае каханне». Меладрама.***
**17.35** «Скарбы О.К.» Прыгоды.*
**19.30** «Мастацтва кахаць». Меладрама.***
**21.00** «Няма сексу — няма грошай». Камедыя.***
**22.45** «Старая добрая оргія». Камедыя.***

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.40** «Ёсць адзін сакрэт».
**8.05** «Доктар І...»
**8.30, 19.00** «Вузел лёсу». Серыял.
**10.15, 3.40** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**12.00** «Сляпая».
**13.00** «Варажбітка».
**14.05, 5.10** «Паралельны свет».
**15.05** «Вайна нявест».



**15.35** «Здзелка».
**16.10** «Натуральны адбор».
**17.05, 22.10** «Рэвізора».
**18.05** «Тайны следства». Серыял.
**20.55** «Спатканне з зоркай».
**23.35** «Алігарх ТБ».
**0.05** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.50** «Салдат Джэйн». Драма.***
**2.50** «Амерыканскі жаніх».

### ТБ1000

**6.10, 18.00** Начны цягнік да Лісабона.***
**8.20** Далёка-далёка.*
**11.05** Патрыёт.***
**14.15** Двайное жыццё Чарлі Сан-Клауда.***
**16.10** Як злавіць монстра.****
**20.10** Закаханы Шэкспір.0
**22.30** Паляўнічыя на тролляў.***
**0.30** Зорная карта.****
**2.30** Адна сустрэча.***
**4.05** Джо.***

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Перамір'е.***
**8.25** Галасы вялікай краіны.
**10.30** Купрын. Упоцемку.***
**12.35** Старое добрае кіно. Што ў Сенькі было.0
**14.10** Сіндром Пятрушкі.***
**16.10** Знаходка.****
**18.20** Пацалунак скрозь сцяну.***
**20.20** Закахаць і абясшкодзіць.*
**22.35** Індыга.***
**0.35** Купрын. Упоцемку.***
**2.45** Пах верасу.***
**4.35** 30 спатканняў.***

### National Geographic

**6.00, 13.20** Гульні розуму.*
**6.45, 5.35** Навуковыя недарэчнасці.*
**7.50, 10.55, 14.50** Мегазаводы.*
**8.40, 15.40** Міжнародны аэрапорт Дубай.***
**9.25** Золата Юкана.*
**10.10** Паранармальнае.***
**11.45, 16.25, 19.30, 23.20, 2.30** Расследаванні авіякатастроф.*
**12.30, 18.45, 21.45, 1.40, 4.45** Марс.*
**18.00, 21.00, 0.55, 4.00** Аўта-SOS.*
**20.15** Чалавек супраць YouTube.*
**22.35** Прарыў 2.***

### Discovery

**8.00, 14.00 19.00** Залатая ліхаманка.***
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена?*
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена?*
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Склады.*
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Бітва за нерухомасць.*
**11.00** Пяцёрка найлепшых.*
**17.00, 22.00, 2.55** Вялікі махінатар.*
**18.00** Як пабудаваць... што заўгодна.*
**20.00** Вялікая нафта Ірака.*
**0.00, 3.50** Выжыць любой цаной.*
**1.00, 6.20** Не спрабуйце паўтарыць.***
**2.00, 4.40** Маланкавыя катастрофы.***




## Дурныя жарты пахвалы не варты

Першы дзень красавіка называюць па-рознаму: дзень гумару, дзень дурня, смеху, лгуна... У любым выпадку гэта — свята, прычым любімае, у многіх краінах. І наша тут не выключэнне. Мае бацькі і дзяды, наколькі помню, першага красавіка лічылі за правіла не проста некага падмануць, але і, што называецца, развесці, разыграць.

Іх, дарэчы, разыгрывалі таксама. У прыватнасці, мой дзядзька Нарцыз Лаўрыновіч расказваў, як некалі «пажартавалі» з ягонага бацькі (а майго, значыць, дзеда). Той быў майстрам-будаўніком, у канцы 50-х гадоў у вёсцы Спонды ўзводзіў цялятнік.

Дык вось, у той дзень брыгада неяк дужа запрацавалася: толькі пад вечар мужчыны ўспомнілі, што празвалі свята, што забыліся пажартаваць, некага падмануць...

Гэта стала першай нагодай, каб выпіць па чарцы. Тут жа знайшлася другая: перазімавалі, на двары (а дакладней, на календары) — вясна...

Што яны пілі і чым закусвалі, не так важна. Важна, што адзін з маладых будаўнікоў-падсобнікаў забедаваў, што яму ўжо трэба дамоў, бо жонка, калі ён запозніцца, можа прыбегчы сюды, на будоўлю, і такое ўчыніць, — мала не падасца...

— А ты б паказаў ёй, хто ў доме гаспадар, — параіў падсобніку адзін з майстроў. — Жонку ж трэба любіць як душу і трэсці як грушу.

— Не абавязкова, — прызнаў мой дзед. — Можна проста адно аднаму даваріць. Вось як мы з Яняй: я магу тут хоць да ранку сядзець, — яна не прыбяжыць.

— А давай паглядзім, — загарэлася вока ў падсобніка, які, відаць, з «дапамогай» гарэлкі, прыдумаў, **што** сёння можна зрабіць, каб Яня такі прыбегла.

Для гэтага ён ускочыў на каня, паімчаў да яе дадому і там з сумнай мінай паведаміў, што на будоўлі звалілася бервяно і ўсё... Яе муж... загінуў.

Яня, як і варта было чакаць, заламала рукі, загаласіла, але ж пры гэтым розум не страціла. Падумала, што калі ўжо здарылася тое непапраўнае, то цела мужа (не адзін жа ён на аб'екце) зараз прывязуць, а ёй тым часам трэба думаць пра пахаванне, пра тое, як сабраць на яго раскіданую па свеце сям'ю ды радню.

...У гэты час у Жукойненскім клубе ішла генеральная рэпетыцыя Купалавай «Паўлінкі». Нарцыз вось-вось павінен быў выйсці на сцэну ў ролі Янкі, але...

Але з вёскі прыехаў ганец з запіскай: маці паведамляла пра смерць бацькі і прасіла адправіць тэлеграмы старэйшай сястры Аліцыі, што вучылася ў Вільні ў інстытуце, і брату Леанарду, які адбываў вайсковую службу на Кольскім паўвостраве.

Першую тэлеграму ў Нарцыза прынялі, другую — не, бо яе трэба было завераць.

А пакуль, не хаваючы слёз, хлопец ляцеў дадому.

Адчыніў там хату і як не здурнеў ад шчасця: бацька — жывы і здаровы сядзеў за сталом! Маці растлумачыла, што іх... разыгралі — у гонар дня смеху.

Далей бацька расказваў, што ён, відома ж, згледзеў, як той падсобнік конна некуды падаўся. Брыгада яшчэ ўголас пасмяялася, што, маўляў, дадому, каб жонку не ўгнявіць. Аж хутка той прыехаў назад. Сказаў, што зараз — як піць даць! — з'явіцца і Яня...

Дзед зразумеў, што гэта не проста так: загнаў падсобніка ў кут, прымусіў ва ўсім прызнацца і ўжо сам на кані панёсся дадому, каб супакоіць жонку.

Шкада, што дачку не маглі: Аліцыя, атрымаўшы тэлеграму, пазычыла грошай, наняла таксі. І машына везла яе, аж пакуль пад коламі была дарога. Далей гэтае дзяўчо па цёмначы, па лесе і бязлюддзі дзесяць кіламетраў адмахала пехам.

Святло ў сваёй хаце ўбачыла здалёку, але ж гэтым разам не адчула ніякай радасці: наадварот — сэрца яе заходзілася ад гора. А таму Аліцыя, сабраўшы ў кулак апошнія сілы, адчыніла дзверы, пераступіла парог і...

Калі карацей, то ўсё было нібы ў казцы! Але ж колькі забрала здароўя і сіл, колькі ўрэшце грошай!

Вось такі быў «розыгрыш». І расказаць пра яго, мусіць, трэба было, каб магчыма, спыніць падобных жартаўнікоў, каб нагадаць ім, што смех наводзіць на грэх, што ён жа можа плачам адгукнуцца...

Бытуюць такія прымаўкі. І, вядома ж, не без падстаў.

**Іаланта Валуевіч,**
*в. Хацежына, Мінскі раён.*

## Вынаходнік

...Дзень той пачынаўся добра. Мы з сябрам Толікам са сваёй вёскі Крушнікі выбраліся ў дарогу — у Петрыкаў, на другі бок Прыпяці, за 25 вёрстаў.

Пакуль дайшлі да пераправы, пакуль на пароме з дзедам Міхедам пераплылі цераз рэчку, сонца стала брацца пад поўдзень. А яшчэ ж і дамоў...

Мы спяшаліся, таму першае, што зрабілі ў горадзе, — адшукалі кнігарню, купілі падручнікі: я сабе — для сёмага класа, мой сябра — для пятага. Кнігі нам перавязалі шпагатам, і мы, з гэтай ношай, па брукаванцы, падаліся ў сталоўку.

Па дарозе, праўда, не ўтрымаліся — купілі марозіва. Са смакам з'елі, але ж грошай пасля гэтага амаль не засталося: у сталовай узялі толькі па порцыі нейкага супчыку ды па дзве тонкія лустачкі хлеба.

На першую — як дарослыя — і я, і Толік намазалі па добрым слоі бясплатнай гарчыцы, што стаяла на сталіках (еш не хачу...). Адкусілі і дружна зайшліся ад кашлю: не, гэту намазку нездарма называюць гарчыцай!

Мажны дзяцюк, што сядзеў паблізу, уплятаючы капусту, заядаючы яе катлетамі (на сталe іх цэлая талерка была!) і запіваючы півам, з нас ад душы пасмяяўся. А потым, падобна, пашкадаваў: на адну з папярак, што стаяла ў шкляначцы замест сурвэтак, палажыў дзве катлеткі і працягнуў нам. Мы нават смаку не разабралі...

На гэтым «абед» быў скончаны. Мы з Толем пайшлі да выхаду, а там, на двары (патрэба ўзнікла, і не маленькая...) — да скасабочанай прыбіральні на дзве кабінкі. Я заняў бліжэйшую і дзверы стаў трымаць рукой, бо ніякай зашчапкі там не было. А вось што зрабіў мой сябар, — дайшло хіба потым.

А тады праз шчыліну ў дошках я згледзеў, што ў бок гэтага ж маленькага «доміка» кіруе ўжо знаёмы дзяцюк: набліжаецца, у дзвярах маёй кабінкі, пэўна ж, бачыць пальцы, а таму з сілай цягне на сябе дзверы суседняя, разам з якімі з голым азадкам у двор вылятае Толік.

На хаду яшчэ ён неяк дзіўна глядзіць у мой бок, быццам хоча заплакаць, але не паспявае: спехам падцягвае свае картовыя порткі і, трымаючы іх у руках, рушыць да вязанак з кнігамі.

Потым аказалася, што ён паленаваўся трымаць свае дзверы рукой. Таму са штонікаў выцягнуў дзяжку, адзін канец яе накінуў на шыю, а другі зачапіў за цвік, што тырчаў у дзвярах...

Факт, што па дарозе дамоў мы з ім збольшага маўчалі. Сябар, відаць, перажываў, што паказаў сябе ў горадзе не найлепшым «бокам», а я — успамінаў тую «карціну» ды ціха рагатаў, думаў, што з Толіка павінен вырасці нядрэнны вынаходнік.

**Анатоль Кашэвіч,**
*в. Краснабярэжжа, Лельчыцкі раён.*

## З кута ў кут і... шчасце тут?

Было гэта ў тыя часы, калі расфарміроўвалі МТС.

Размова, ну вядома ж, не пра мабільнага аператара, бо ў той час нават электрычнасці не было, адзін тэлефон на ўвесь калгас...

А расфарміроўвалі машынна-трактарныя станцыі, прычым — на бяду ўсім трактарыстам, механікам, слесарам. Яны ж там рабочымі былі, атрымлівалі зарплату. Апроч таго, калі раз'язджаліся ў камандзіроўкі па калгасах, то старшыні, разумеючы, як шмат залежыць ад механізатараў, стараліся пасяліць іх на кватэры да найлепшых гаспадынь, выпісвалі мяса з малаком ды нават мёд...

А тут — на табе: уся тэхніка перадаецца ў гаспадаркі. Выходзіць, што і механізатары будуць працаваць за палачкі?

Не многія згадзіліся — рванулі, хто куды мог. Вербаваліся на Далёкі Усход, у Сібір, у Карэлію. Я гэта ведаю, бо мой брат, які з 16-ці гадоў працаваў у МТС, у 18 — падаўся на лесанарыхтоўкі, к чорту на рогі, як той казаў.

Але ж гэта было потым, а тады...

У нашу вёску, значыць, прыслалі трактарыста Шурку. Хлопец як быццам нішто сабе: працавіты, гаваркі. Сказаў, што сірата. Старшыня, можа, нават з дальнім «прыцэлам», яго ў добрую сям'ю пасяліў. І хаціна там была спраўная, і гаспадарка (сваё малачко, сала, яйкі)... Наваt садок быў, што на той час — вялікая рэдкасць, бо за кожнае дрэўца трэба было падатак плаціць.

Адным словам, Шурка ў гэтай сям'і плаваць стаў, як сыр у смятане!

Бо да ўсяго ў сталых ды ціхмяных гаспадароў была дачушка-паскрэбак, дзеўка такая ж спакойная і старанная, але ж не сказаць, каб прыгожая.

А зрэшты, як тую прыгажосць і разглядзець было, калі яна даяркай працавала? Вечна хадзіла ў ватоўцы ды гумовіках, уручную кароў даіла, вёдры цягала, а яшчэ ж і дома не пасядзіш, бо клопату шмат, а Надзя ў бацькоў адна — трое братоў з вайны не вярнуліся.

Шурка, кватарант, як быццам не супраць быў у прымах застацца, але ж спачатку адпрасіўся ў старшыні да радні пад'ехаць — рэчы забраць.

Гэта, як быццам, добры знак? Але ж дрэнна іншае: Шурка (людзі ўбачылі) паехаў... не адзін, а з Валькай-стрэлачніцай — дзеўкай прыгожай, падатлівай... Гуляў з ёй кожны, хто хацеў. Шурка, выходзіць, таксама?..

Чутка пра гэта, ну напэўна ж, дайшла да Надзі, да яе бацькоў.

Што яны там думалі, я не ведаю — малая была.

Але ж помню, што «парачка» вярталася назад якраз у нядзелю: з горкі ў нас відаць было, хто на станцыю ідзе, хто адтуль...

Факт, што «разведка» ўбачыла, як Шурка з Валяй ледзь не пад ручку ішлі — аж да развілкі. А там — разлучыліся: хлопец пайшоў так да Надзі пайшоў.

Праз нейкі час яны ціха распісаліся і зажылі — гэтак жа ціха і дружна, душа ў душу. Вёска надзівіцца не магла! І толькі потым, праз многія гады, дазналася пра «сакрэт» іх шчасця.

Аказалася, што мясцовыя падлеткі ў тую нядзелю, калі Шурка з Валяй вярталіся ў вёску, у Надзіных сенцах зрабілі... «засаду». Гэта значыць Шурка на парог — дзверы за ім на зашчэпку. І «ў цёмную», увасьмёх, давай перакідваць яго з рук на рукі, з кута ў кут. Пры гэтым ніхто нічога не выкрыкваў, не казаў, бронь божа, не біў... Проста моўчкі далі чалавеку зразумець, што хоць братоў у Надзі няма, але ж гэта не значыць, што заступіцца за дзеўку няма каму!

...Даўняя гісторыя, але ж павучальная, як і прымаўка: глядзі, каб ты пяты кут не шукаў, бо гэта ж не заўсёды бывае на шчасце?

**Любоў Чыгрынава,**
*г. Мінск.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

■ Неасабісты суб'ектыў



# ПРАТЭРМІНАВАНАЯ ЗАПАЗЫЧАНАСЦЬ

## Ці патрэбны чалавечы фактар у выкананні літары закона

На вясковай вуліцы ў гэты час — да пачатку агародна-дачнага сезона, ды яшчэ і ў «немагазінны» дзень — сустрэць чалавека вялікая рэдкасць. Празрыстая бадзёрая цішыня звініць на сонечных промнях. Толькі шпакі са свістам носяцца з дрэва на дрэва, абжываючы свае дамкі і выганяючы з іх няпрошаных гасцей — вераб'ёў, якія ўзнімаюць з гэтай нагоды пакрыўджаны істэрычны вэрхал...

А тут на табе — дзве машыны — адна з «будкай», другая з люлькай-пад'ёмнікам, чалавек пяць незнаёмых дзецюкоў у іх прыехалі. Спыніліся каля Андрэевай хаты, пачалі засяроджана корпацца з нейкім рыштункам. Тут і сам Андрэй на машыне прымчаў, размахваюць, нешта вырашаюць... Карацей, у лакальным маштабе нашай «Мурлындзіі» (як пяшчотна завуць вёску зімой, ранней вясной і позняй восенню — калі няма дачнікаў — яе нешматлікія пастаянныя жыхары) — сапраўдная падзея.

Аказалася, дзецюкі на машынах — электрыкі, прыехалі праводзіць Андрэю ў хату электрычнасць, якую за месяц да таго абрэзалі за няўплату. Адзіны спосаб так кардынальна пакараць неплацельшчыка ў вёсцы — гэта не шчоўкнуць нейкім выключальнікам, а літаральна абрэзаць провад, што ідзе ад слупа на вуліцы да застрэшка хаты. Што, уласна кажучы, і зрабілі. А цяпер вось, калі справа ўладжана, грошы заплачаны, прыехалі тыя ж людзі рабіць усё з дакладнасцю наадварот — правады чапляць.

Не, вы не падумайце, Андрэй — не п'яніца і не лайдак. З тым, як ён з сям'ёй апынуўся ў нашай вёсцы і як пасля з'ехаў, — увогуле асобная гісторыя. Яму гадоў пад пяцьдзясят, калі не больш, а жонка маладзенькая і дачушка зусім малая. З імі жыве яшчэ яго сын-падлетак ад першага шлюбу. Андрэй забраў яго ў першай жонкі пры разводзе, пакінуўшы ёй сталічную кватэру. У новай «палавінкі» пасяліцца не было дзе, вось яны, рафінаваныя гараджане, з немаўлём на руках апынуліся ў драўлянай не вельмі дагледжанай хаце, якую пасля смерці дзядзькі-бабыля яго далёкія сваякі паспяшаліся прадаць. Вёска глядзела на гэтых навасёлаў са скептычнай цікаўнасцю: ці надоўга іх хопіць? Высветлілася: не надоўга, на паўтара года. Зімой у хаце холадна, колькі ні палі ў той печы, вада і ўсе выгоды на двары, малому ў школу тры кіламетры хадзіць і ў класе там два чалавекі, бацьку на працу ездзіць штодня ў Мінск на машыне накладна, а тут яшчэ і краму зачынілі, аўталаўка два разы на тыдзень прыязджае... Карацей, вельмі хутка гэта сям'я стала «як усе нармальныя людзі» — перасялілася назад у горад, а хату пакінулі пад дачу.

За электрычнасць, з'ехаўшы ўвосень, яны заплаціць проста забыліся (з кім не бывае?). Служба энергазбыту пачакала колькі належыць — і правады абрэзала. Гаспадар, прыехаўшы, як пацяплела, праведаць сядзібу, проста стаў перад фактам: святла няма. Пачаў тэлефанаваць і даведаўся, што трапіў у ганебныя спісы неплацельшчыкаў. Тут табе і штраф, і пеня, і лішнія клопаты: давялося ў будны дзень імчаць у вёску з працы аднекуль з-пад Асіповічаў, бо гэта абрэзаць правады могуць і без гаспадара, а калі цягнуць наноў — хто ж без яго возьмецца? А калі дадаць яшчэ, па сутнасці, бессэнсоўную работу брыгады электрыкаў, якія ехалі з райцэнтра за дваццаць восем кіламетраў спачатку рэзаць, пасля вешаць тое, што адрэзалі, — увогуле нешта вельмі падобнае на тэатр абсурду атрымліваецца...

Зразумела, плаціць трэба. Зразумела, меры да злосных неплацельшчыкаў трэба прымаць самыя жорсткія. Зразумела, усё зроблена паводле закона. Але ёсць адно маленькае «але», у законе не прапісанае, — чалавечы фактар. Чаму б тым, хто кантралюе плацяжы на ўзроўні раёна, элементарна не нагадаць гаспадару аб няўплаце? Дапусцім, калі гаспадар — дачнік, яго дакладных кантактаў можна не знайсці (дапушчэнне, трэба сказаць, не вельмі пераканаўчае ў XXI стагоддзі). Але ж можна патэлефанаваць на мясцовае аддзяленне сувязі (паштальёны ў вёсцы, як правіла, усё пра ўсіх ведаюць), якое ўпаўнаважана плацяжы прымаць, і спытацца: а што там у вас за грамадзянін N, які ўжо каторы месяц не плаціць? Можа, здарылася што: захварэў ці памёр, не дай бог? Ці проста забыўся (з кім не бывае?). І толькі пераканаўшыся ў тым, што чалавек плаціць не хоча і не збіраецца, прымаць катэгарычныя меры (чытай: траціць дзяржаўныя грошы, бо выезд той жа брыгады электрыкаў са спецабсталяваннем на немалую адлегласць каштуе, я думаю, не капейкі).

Я сама летась у падобнай дурной сітуацыі апынулася. Забылася, што трэба штомесяц уносіць абаненцкую плату за мамін вясковы тэлефон, якім паўгода ніхто не карыстаецца. Цана пытання была — семдзесят тысяч старых рублёў, але справа ў сакавіку ўжо дайшла да суда аб пазбаўленні нумара. Прычым суд, я так разумею, меркаваўся быць завочным, без адказчыка, бо шукаць бесталковую гаспадыню, якая тых семдзесят тысяч завінавацілася, ніхто нават не спрабаваў. Пакуль справу ўладжвала, тэлефон ужо паспелі адключыць назусім і беззваротна, таму, калі непаразуменне было выпраўлена, спецыяльна з райцэнтра прыязджалі два майстры нумар падключаць. (Пра маральныя выдаткі гаспадароў і пра матэрыяльныя дзяржавы ад гэтага непаразумення прамаўчу, каб не паўтарацца).

Прычым робіцца падобнае, варта зазначыць, менавіта ў вёсках і мястэчках, дзе людзі, як ні парадаксальна, адно пра аднаго ўсё ведаюць. У безаблічным вялізным горадзе на чалавечыя стасункі спадзявання няма — працуе аўтаматыка: пра тое, што час заплаціць за тэлефон, табе паведаміць металічны голас, пра запазычанасць па кватэрплаце напішуць у СМС...

А там, куды падобныя даброты цывілізацыі яшчэ не дайшлі, усяго толькі і трэба — зняць тэлефонную трубку і пацікавіцца: што там за сітуацыя ў грамадзяніна N, ці здаровы, ці, можа, памёр, не дай бог. Але ж «зняць трубку і пацікавіцца» ні ў адным нарматыўна-прававым акце не напісана, а значыць, і рабіць гэта зусім не абавязкова — можна адразу выпісваць штраф, рахунак, павестку ў суд.

Ці варта здзіўляцца, што з выкананнем таго ж дэкрэта №3 на месцах такіх агароджаў нагарадзілі? Чалавечы фактар, спадарства, чалавечы фактар...

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
на 31 декабря 2016 г.

| | |
|---|---|
| Организация | ОАО «БЕЛВТОРЧЕРМЕТ» |
| Учетный номер плательщика | 100071565 |
| Вид экономической деятельности | переработка отходов и лома черных металлов |
| Организационно-правовая форма | Открытое акционерное общество |
| Орган управления | ОАО «БМЗ – управляющая компания холдинга «БМК» |
| Единица измерения | тыс. руб. (BYN) |
| Адрес | Минский район, аг. Гатово, АБК с проходной, к. 83 |

| Активы | Код строки | На 31 декабря 2016 г. | На 31 декабря 2015 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 59 403 | 57 957 |
| Нематериальные активы | 120 | 11 | 10 |
| **Доходные вложения в материальные активы** | **130** | **-** | **-** |
| В том числе: | | | |
| инвестиционная недвижимость | 131 | - | - |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | - | - |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | - | - |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 290 | 24 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 34 081 | 34 100 |
| Отложенные налоговые активы | 160 | 14 | 1 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | - | - |
| в том числе аккредитивы | 171 | - | - |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | 65 | 43 |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **93 864** | **92 135** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| **Запасы** | **210** | **8 258** | **9 529** |
| В том числе: | | | |
| материалы | 211 | 8 029 | 9 096 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | - | - |
| незавершенное производство | 213 | 13 | 12 |
| готовая продукция и товары | 214 | 216 | 421 |
| товары отгруженные | 215 | - | - |
| прочие запасы | 216 | - | - |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | - | - |
| Расходы будущих периодов | 230 | 156 | 189 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 216 | 202 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 35 254 | 30 618 |
| в том числе аккредитивы | 251 | - | - |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | - | - |
| Денежные средства и эквиваленты денежных средств | 270 | 181 | 140 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | - | - |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **44 065** | **40 678** |
| **БАЛАНС** | **300** | **137 929** | **132 813** |

| Собственный капитал и обязательства | Код строки | На 31 декабря 2016 г. | На 31 декабря 2015 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 69 524 | 69 524 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | - | - |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | - | - |
| Резервный капитал | 440 | 104 | 96 |
| Добавочный капитал | 450 | 23 456 | 18 976 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 21 223 | 18 387 |
| Чистая прибыль(убыток) отчетного года | 470 | - | - |
| Целевое финансирование | 480 | - | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **114 307** | **106 983** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 2 218 | 3 487 |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | 959 | - |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 540 | 5 | 6 |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | - | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **3 182** | **3 493** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 1 886 | 214 |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | - | 2 267 |
| **Краткосрочная кредиторская задолженность** | **630** | **18 048** | **19 350** |
| В том числе: | | | |
| поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 15 588 | 16 421 |
| по авансам полученным | 632 | 5 | 7 |
| по налогам и сборам | 633 | 451 | 367 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 91 | 109 |
| по оплате труда | 635 | 272 | 292 |
| по лизинговым платежам | 636 | 336 | 1 153 |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | - | - |
| прочим кредиторам | 638 | 1 305 | 1 001 |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 640 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 650 | 236 | 236 |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | 270 | 270 |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | - | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **20 440** | **22 337** |
| **БАЛАНС** | **700** | **137 929** | **132 813** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
за январь – декабрь 2016 г.

| Наименование показателей | Код строки | За январь – декабрь 2016 г. | За январь – декабрь 2015 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 70 177 | 71 508 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | ( 60 618) | ( 63 330) |
| **Валовая прибыль** | **030** | **9 559** | **8 178** |
| Управленческие расходы | 040 | ( 2 564) | ( 2 599) |
| Расходы на реализацию | 050 | ( 182) | ( 195) |
| **Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг** | **060** | **6 813** | **5 384** |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 1 047 | 1 009 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | ( 3 589) | ( 3 388) |
| **Прибыль (убыток) от текущей деятельности** | **090** | **4 271** | **3 005** |
| **Доходы по инвестиционной деятельности** | **100** | **88** | **497** |
| В том числе: | | | |
| доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 27 | 108 |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 102 | - | - |
| проценты к получению | 103 | 49 | 179 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | 12 | 210 |
| **Расходы по инвестиционной деятельности** | **110** | **( 19)** | **( 392)** |
| В том числе: | | | |
| расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | ( 6) | ( 214) |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | ( 13) | ( 178) |

| Наименование показателей | Код строки | За январь – декабрь 2016 г. | За январь – декабрь 2015 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **Доходы по финансовой деятельности** | **120** | **198** | **505** |
| В том числе: | | | |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 198 | 505 |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | - | - |
| **Расходы по финансовой деятельности** | **130** | **( 399)** | **( 561)** |
| В том числе: | | | |
| проценты к уплате | 131 | ( 31) | ( 14) |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | ( 221) | ( 490) |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | ( 147) | ( 57) |
| **Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой деятельности** | **140** | **( 132)** | **49** |

| Наименование показателей | Код строки | За январь – декабрь 2016 г. | За январь – декабрь 2015 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **Прибыль (убыток) до налогообложения** | **150** | **4 139** | **3 054** |
| Налог на прибыль | 160 | ( 1 094) | ( 649) |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | 13 | - |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | - | - |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 190 | - | - |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | ( 1) | ( 2) |
| **Чистая прибыль (убыток)** | **210** | **3 057** | **2 403** |
| Количество прибыльных организаций | 211 | 1 | 1 |
| Сумма прибыли | 212 | 3 057 | 2 403 |
| Количество убыточных организаций | 213 | - | - |
| Сумма убытка | 214 | - | - |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | 4 573 | 7 177 |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | - | - |
| **Совокупная прибыль (убыток)** | **240** | **7 630** | **9 580** |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию, рублей | 250 | 6 | 5 |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию, рублей | 260 | - | - |

| № п\п | Наименование показателей | Ед. изм. | Количество |
|---|---|---|---|
| 1 | Доля государства в уставном фонде эмитента | % | 0 |
| 2 | Количество акционеров | лиц | 1 |
| 3 | в том числе юридических лиц | лиц | 1, из них нерезидентов Республики Беларусь – 0 |
| 4 | в том числе физических лиц | лиц | 0, из них нерезидентов Республики Беларусь – 0 |

| № п\п | Наименование показателя | Ед. изм. | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Начислено на выплату дивидендов в отчетном периоде | тыс. руб. | **0** | **0** |
| 2 | Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде | тыс. руб. | **0** | **0** |
| 3 | Дивиденды, приходящиеся на 1 простую акцию (включая налоги) | руб. | **0** | **0** |
| 4 | (на общем годовом собрании акционеров от 26 февраля 2016 года было принято решение не начислять и не выплачивать дивиденды за 2015 год) | | | |
| 5 | Обеспеченность акции имуществом общества | руб. | 230,17 | 215,4 |
| 6 | Акции, поступившие на баланс общества | шт. | 0 | 0 |
| 7 | Количество акций, находящихся на балансе общества | шт. | 0 | 0 |
| 8 | Среднесписочная численность работающих | человек | 728 | 784 |

| | |
|---|---|
| Основные виды продукции, по которым получено 20% и более выручки от реализации товаров, продукции, работ и услуг | Переработка лома и отходов черных металлов (38321) |
| Дата утверждения акционером годового отчета, баланса, отчета о прибылях и убытках за отчетный 2016 год | 30 марта 2017 года |
| Сведения о применении открытым акционерным обществом Свода правил корпоративного поведения | принят к сведению |
| Адрес официального сайта открытого акционерного общества в глобальной компьютерной сети Интернет | http://www.bvm.by |

Руководитель Аношко А.Д.
Главный бухгалтер Попова Н.Н.
1 марта 2017 г.

ФБК
PKF Accountants & business advisers

Беларусь | 220090 | Минск | тракт Логойский, 22А, пом. 201, 13 этаж
Тел./факс +375 (17) 262 5223
E-mail: fbk@fbk.by | www.fbk.by
Исх. №05-01/26-1 от «17» марта 2017 г.

### АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ
**по бухгалтерской отчетности
Открытого акционерного общества «Белвторчермет»
за период с 1 января 2016 года по 31 декабря 2016 года**

Генеральному директору **А.Д. Аношко**

**Реквизиты аудируемого лица**

Открытое акционерное общество «Белвторчермет» (ОАО «Белвторчермет»);
юридический адрес: Республика Беларусь, 223017, Минский р-н, агрогородок Гатово, административно-бытовой корпус с проходной, к. 83;
почтовый адрес: 220005, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Платонова, 20Б-7;
сведения о государственной регистрации: зарегистрировано решением Минского облисполкома от 10.01.2012 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100071565;
УНП 100071565.

**Реквизиты аудиторской организации**

Общество с ограниченной ответственностью «ФБК-Бел» (ООО «ФБК-Бел»);
Республика Беларусь, 220090, г. Минск, Логойский тракт, 22А, пом. 201;
сведения о государственной регистрации: зарегистрировано Минским горисполкомом 6 февраля 2009 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690398039;
УНП 690398039.

Мы провели аудит прилагаемой бухгалтерской отчетности ОАО "Белвторчермет", состоящей из бухгалтерского баланса на 31 декабря 2016 года, отчета о прибылях и убытках, отчета об изменении собственного капитала, отчета о движении денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, а также примечаний к бухгалтерской отчетности.

**ОБЯЗАННОСТИ РУКОВОДСТВА АУДИРУЕМОГО ЛИЦА
ПО ПОДГОТОВКЕ БУХГАЛТЕРСКОЙ ОТЧЕТНОСТИ**

Руководство ОАО "Белвторчермет" несет ответственность за составление и представление бухгалтерской отчетности в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь и организацию системы внутреннего контроля, необходимой для составления бухгалтерской отчетности, не содержащей существенных искажений, допущенных вследствие недобросовестных действий или ошибок.

**ОБЯЗАННОСТИ АУДИТОРСКОЙ ОРГАНИЗАЦИИ**

Мы несем ответственность за выраженное нами аудиторское мнение о достоверности бухгалтерской отчетности, основанное на результатах проведенного аудита.

Мы провели аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь от 12 июля 2013 года «Об аудиторской деятельности» и национальных правил аудиторской деятельности, которые обязывают нас соблюдать нормы профессиональной этики, планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить достаточную уверенность относительно наличия либо отсутствия существенных искажений в представленной бухгалтерской отчетности.

В ходе аудита нами были выполнены аудиторские процедуры, направленные на получение аудиторских доказательств, подтверждающих значения показателей бухгалтерской отчетности ОАО "Белвторчермет", а также другую раскрытую в ней информацию. Выбор аудиторских процедур осуществлялся на основании профессионального суждения с учетом оценки риска существенного искажения бухгалтерской отчетности в результате ошибок или недобросовестных действий. При оценке риска существенного искажения бухгалтерской отчетности нами рассматривалась система внутреннего контроля ОАО "Белвторчермет", необходимая для составления бухгалтерской отчетности, не содержащей существенных искажений, с целью планирования аудиторских процедур, соответствующих обстоятельствам аудита, но не с целью выражения мнения относительно эффективности функционирования этой системы.

Аудит также включал оценку применяемой учетной политики, обоснованности учетных оценок и общего содержания бухгалтерской отчетности ОАО "Белвторчермет".

Мы полагаем, что в ходе аудита нами были получены достаточные и надлежащие аудиторские доказательства, которые могут являться основанием для выражения аудиторского мнения.

**АУДИТОРСКОЕ МНЕНИЕ**

По нашему мнению, бухгалтерская отчетность ОАО "Белвторчермет" достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО "Белвторчермет" на 31 декабря 2016 г., а также финансовые результаты деятельности и изменения финансового положения ОАО "Белвторчермет" за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь.

**ПРОЧИЕ ВОПРОСЫ**

Аудит бухгалтерской отчетности ОАО "Белвторчермет" за предшествующий отчетному период с 1 января по 31 декабря 2015 г. включительно был проведен другим аудитором, ООО «Белросаудит», аудиторское заключение которого датировано 23 февраля 2016 г. и содержит аудиторское мнение без оговорок по такой бухгалтерской отчетности.

Директор ООО «ФБК-Бел» А.Г. Ренейский

Аудитор, возглавлявший аудит Е.В. Радченко

17 марта 2017 г.

---

**Годовой отчет эмитента ценных бумаг
ОАО «РАПС»**
223014, Минский р-н, аг. Крупица, ул. Садовая, 20
**Бухгалтерский баланс на 31декабря 2016 г.**

УНП 600068480 *тыс. руб.*

| №п/п | Наименование показателя | Код строки | На начало года | На конец года |
|---|---|---|---|---|
| | АКТИВ | | | |
| 1 | Долгосрочные активы | 190 | 24754 | 25240 |
| 2 | Краткосрочные активы | 290 | 6880 | 7209 |
| | БАЛАНС | 300 | 31634 | 32449 |
| | ПАССИВ | | | |
| 3 | Собственный капитал | 490 | 16235 | 17917 |
| 4 | Долгосрочные обязательства | 590 | 3045 | 1991 |
| 5 | Краткосрочные обязательства | 690 | 12354 | 12541 |
| 6 | БАЛАНС | 700 | 31634 | 32449 |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 2016 г.** *тыс. руб.*

| №п/п | Наименование показателя | Код строки | За отчетный год | За прошлый год |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Выручка от реализации продукции без налогов | 010 | 12779 | 13641 |
| 2 | Себестоимость реализованной продукции, работ и услуг | 020 | 10006 | 11511 |
| 3 | Управленческие расходы | 040 | 629 | 744 |
| 4 | Расходы на реализацию | 050 | 63 | 49 |
| 5 | Прибыль (убыток) от реализации | 060 | 2081 | 1337 |
| 6 | Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 497 | 1224 |
| 7 | Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | 475 | 1252 |
| 8 | Прибыль (убыток) от текущей деятельности | 090 | 2103 | 1309 |
| 9 | Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | 140 | -159 | -2232 |
| 10 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 150 | 1944 | -923 |
| 11 | Налоги и сборы из прибыли с учетом отложенных налоговых активов и обязательств | 160-200 | 440 | 1 |
| 12 | Прибыль (убыток) к распределению | 210 | 1504 | -924 |

Финансовые показатели подтверждены аудиторской проверкой (положительное аудиторское заключение).

Дивиденды на **привилегированные** акции за 2016 г. выплачиваются с 1 апреля 2017 г. по 1 июля 2017 г.

Порядок выплаты дивидендов:
- работающим и неработающим акционерам – по ведомостям в кассе Общества;
- по заявлениям акционеров – почтовым переводом или перечислением на лицевой счет в ОАО «АСБ Беларусбанк».

Директор Ломако М.С.
Гл. бухгалтер Чалей Н.П.

**Аудиторское заключение о бухгалтерской отчетности открытого акционерного общества «Рапс» за период с 01.01.2016 г. по 31.12.2016 г.**

Аудиторское мнение с оговоркой

По моему мнению, за исключением возможного влияния на бухгалтерскую отчетность обстоятельств, изложенных в разделе «Основания для выражения аудиторского мнения с оговоркой», бухгалтерская отчетность ОАО «Рапс» достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «Рапс» на 31.12.2016 г., а также финансовые результаты деятельности и изменения финансового положения ОАО «Рапс» за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь.

Пояснительный раздел, привлекающий внимание к аспекту

Не изменяя мнения о достоверности бухгалтерской отчетности, обращаю внимание на неудовлетворительное финансовое положение ОАО «Рапс».

Коэффициенты платежеспособности на конец 2016 года ниже нормативных: коэффициент текущей ликвидности составляет 0,57, коэффициент обеспеченности собственными оборотными средствами имеет отрицательное значение.

Информация о финансовом положении ОАО «Рапс» раскрыта мной в письменном отчете по результатам проведенного аудита на страницах 25-26. С учетом вышеизложенного обстоятельства рекомендую ОАО «Рапс» в 2017 году принять меры по оздоровлению финансового положения.

Индивидуальный предприниматель Н.Л. Демидчик
Аудитор (квалификационный аттестат № 0001525 от 05.11.2007 г.)
Дата подписания аудиторского заключения: 10 марта 2017 г.

---

## ОАО «БЕЛЮВЕЛИРТОРГ»
г. Минск, ул. Смоленская, 33, УНП 100129348

**Бухгалтерский баланс за 2016 год** *(тыс. руб.)*

| Актив | Код строки | На 31.12.2016 | На 31.12.2015 |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **17 788** | **16 951** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **49 909** | **37 538** |
| **БАЛАНС (190 + 290)** | **300** | **67 697** | **54 489** |
| **Пассив** | **Код строки** | **На 31.12.2016** | **На 31.12.2015** |
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **20 781** | **17 856** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **734** | **798** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **46 182** | **35 835** |
| **БАЛАНС (490 + 590 + 690)** | **700** | **67 697** | **54 489** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
за январь – декабрь 2016года**

| Наименование показателей | Код строки | За январь – декабрь 2016 года | За январь – декабрь 2015 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг** | **010** | **44 067** | **35 941** |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (030 – 040 – 050)** | **060** | **5 496** | **802** |
| **Прибыль (убыток) от текущей деятельности (±060+070-080)** | **090** | **5 144** | **544** |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности (100 – 110 + 120 – 130 ± 140)** | **140** | **(1418)** | **(52)** |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения (±090 ±150)** | **150** | **3 726** | **492** |
| **ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200 – 250 – 260 – 270)** | **210** | **2 996** | **354** |

**Пункты 4–9 «Информация об открытом акционерном обществе и его деятельности»**
**Количество акционеров ОАО «Белювелирторг» – 2, в том числе юридических лиц – 1**

| Наименование показателей | Ед. изм. | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
